Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 133 (27991) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Уладары паветра

СТАР. 4

Сямейная газета

Гісторыя пераадолення і кахання

Авантурны маршрут

ЦЫТАТА ДНЯ

Сямён ШАПІРА, старшыня Мінскага аблвыканкама:

«Мясцовая ўлада павінна ісці насустрач людзям. Прадстаўнікі райвыканкамаў і сельскіх выканкамаў іншы раз баяцца прымаць сур'ёзныя рашэнні пры разглядзе зваротаў грамадзян, імкнучыся засцерагчы сябе. Аднак гэта няправільны шлях. Неабходна быць больш смелымі ў прыняцці канкрэтных рашэнняў і імкнуцца ўглыбіцца ва ўсе праблемы, з якімі ідуць да іх людзі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.07.2015 г.

Долар ЗША	15 349,00	▲
Еўра	16 905,00	▲
Рас. руб.	270,53	▲
Укр. грыўня	697,68	▲

ISSN 1990 - 763X

АХ, ЯКІЯ БЫЛІ СТРОІ!

Фота БЕЛТА.

У гомельскім філіяле Веткаўскага музея старавераства і беларускіх традыцый імя Ф. Шклярава прадстаўлены новы выставачны праект «Чалавек-Строй-Абрад». Акцэнт выставы жаночых касцюмаў зроблены і на знешняй прыгажосці традыцыйнага жаночага адзення, і на абрадавай сімволіцы кожнага яго элемента і арнаменту, якія старанна ткаліся альбо вышываліся на кашулях. У святочны дзень жанчына апранала свае найлепшыя строі, каб пакрасавацца не толькі перад людзьмі, але і перад Богам. Навуковы супрацоўнік музея Сяргей Чавус з задавальненнем расказвае пра гэта наведвальнікам выставы.

■ Па сезоне

КУРОРТЫ ПАВЫШАНАЙ НЕБЯСПЕКІ

Ад падарожжа ў якія краіны гэтым летам лепш адмовіцца і колькі грошай фірма павінна вярнуць за нерэалізаваны тур?

Устрымацца ад паездак у небяспечны сёння Туніс Міністэрства спорту і турызму рэкамендавала яшчэ два тыдні таму. «Тэракты бываюць розныя, напрыклад, па палітычных матывах, калі людзі, якія прыехалі на адпачынак, гінуць выпадкова. Але ў Тунісе «паляванне» вялося менавіта на турыстаў, сітуацыя неардынарная. Таму мы не сталі чакаць рэакцыі Міністэрства замежных спраў і ўлады Туніса і апублікавалі рэкамендацыю не наведваць краіну. Толькі потым, праз 2-3 дні, сама афрыканская дзяржава абвясціла надзвычайнае становішча», — тлумачыць рашэнне дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту Вадзім КАРМАЗІН.

СТАР. 3

■ Як нас дураць

БЯЛІЗНА І ПОСУД ЯК ПРЫКРЫЦЦЁ

Як пенсіянеры становяцца ахвярамі ашуканцаў

Пра тое, што нельга адчыняць дзверы незнаёмцам, усе мы чулі з дзяцінства. І калі малеча яшчэ, баючыся ці то дарослых дзядзькаў з вуліцы, ці то бацькоў, ад якіх за непаслухмянасць і «ўляцець» можа, з крыкам «А мамы дома няма!» трымаюць абарону, то старыя часам забываюцца на правілы бяспекі. Так, днямі на хітрыкі махляроў «павялася» 84-гадовая жыхарка Першамайскага раёна сталіцы.

Пенсіянерка была дома адна, калі ў дзверы пазванілі. Маладая жанчына, што хадзіла па пад'ездзе, прапаноўвала купіць камплект пасцельнай бялізны. Збыць тавар не атрымалася, але затое махлярка ўпэўнілася, што, акрамя бабулі, у кватэры больш нікога няма. Даведалася і пра магчымае месца захоўвання каштоўнасцей. Інфармацыю жанчына перадала дзвюм «сяброўкам», што чакалі на лесвіцы. Праз некалькі хвілін у кватэру пенсіянеркі зноў пазванілі. Саўдзельніцы гандляркі бялізнай прадставіліся супрацоўнікамі арганізацыі па абслугоўванні газавага абсталявання. Пакуль адна, каб адцягнуць увагу старой, рабіла выгляд, што правярае газавую пліту, другая шукала схованку з грашыма. І знайшла: з хрустальнай вазы ў шафе прапалі восем мільёнаў.

СТАР. 3

■ Выбары-2015

ТРЫ ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ГРУПЫ

Учора ў Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў былі пададзеныя дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні Калякіна Сяргея Іванавіча і Гайдукевіча Сяргея Васільевіча кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік першай ініцыятыўнай групы — Валерый Пятровіч Ухналёў, другой — Анатоль Пятровіч Хішчэнка.

Такім чынам, як паведамляе афіцыйны сайт Цэнтрвыбаркама, на вечар серады ў ЦВК пададзеныя заявы трох асоб, якія маюць намер удзельнічаць у выбарах у якасці кандыдатаў: дзеючага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, кіраўніка Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргея Калякіна і старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) Сяргея Гайдукевіча. Для Аляксандра Лукашэнкі гэта пятая па ліку выбарчая кампанія, чатыры папярэднія былі для яго пераможныя. Сяргей Калякін удзельнічаў у прэзідэнцкіх выбарах у якасці прэтэндэнта на пост кіраўніка дзяржавы ў 2001 годзе, але яго ініцыятыўная група тады не набрала неабходнай для рэгістрацыі кандыдатам колькасці подпісаў. Сяргей Гайдукевіч удзельнічаў у трох прэзідэнцкіх кампаніях: 2001, 2006 і 2010 гадоў. У 2001-м за яго прагаласавала 2,48% выбаршчыкаў, у 2006-м — 3,5%. У 2010 годзе ён зняў сваю кандыдатуру на этапе збору подпісаў.

ЕЎРАПЕЙСКАЯ МІСІЯ НАВЕДАЛА ЦЭНТРВЫБАРКАМ

У сераду старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына і сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік сустрэліся з прадстаўнікамі ацэначнай місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ) і дырэктарам па пытаннях выбараў Парламенцкай асамблеі АБСЕ Андрэасам Бэйкерам.

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні міжнароднага назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2015 годзе. Мікалай Лазавік, каментуючы вынікі сустрэчы, заўважыў: «Была выказана ўдзячнасць, што Рэспубліка Беларусь запрасіла місію для назірання за выбарамі. Гэтым запрашэннем яна абавязкова скарыстаецца».

Кіраўніцтва ЦВК Беларусі азнаёміла місію з тым, як праходзіць падрыхтоўка да выбараў. «Было адзначана, што работа вядзецца ў адпаведнасці з каляндарным планам. Цяпер ідзе этап падачы дакументаў для рэгістрацыі ініцыятыўных груп патэнцыяльных кандыдатаў і фарміраванне тэрытарыяльных камісій», — сказаў Мікалай Лазавік. Ён падкрэсліў, што ЦВК нацэльвае камісіі на месцах на тое, каб кампанія праходзіла свабодна, дэмакратычна і без лішніх абмежаванняў і забарон. «У час семінараў, у ходзе маючых адбыцца трэнінгаў членаў выбарчых камісій будзем акцэнтаваць увагу на тым, каб адносіны ўсіх суб'ектаў выбарчага працэсу — і палітычных партый, і грамадскіх аб'яднанняў, і кандыдатаў, і давераных асоб, і членаў камісій, і наглядальнікаў — былі ўважлівымі і не выходзілі за рамкі заканадаўства», — дадаў Мікалай Лазавік.

Ацэначную місію БДІПЧ АБСЕ, якую прадстаўлялі старшы саветнік па выбарах Таццяна Багусевіч і саветнік дэпартамента па выбарах Уладзімір Місеў, цікавіла сістэма выбарчых камісій: склад ЦВК, парадак яе фарміравання, колькасць тэрытарыяльных і ўчастковых выбаркамаў і іншае. «Асаблівую ўвагу яны звярнулі на нядаўнія змяненні выбарчага заканадаўства. У прыватнасці іх цікавіла такая норма, як фарміраванне фондаў кандыдатаў. Які парадак фарміравання, як ажыццяўляецца кантроль за выкарыстаннем фінансаў», — растлумачыў сакратар ЦВК. Удзельнікі місіі задалі і многія іншыя пытанні, у тым ліку пацікавіліся, ці выконваецца норма, згодна з якой адна трэць камісій павінна складацца з прадстаўнікоў партый і грамадскіх аб'яднанняў. «Гэтая норма ў нас выконваецца паўсюль, нават у самых аддаленых сельскіх населеных пунктах. Калі там няма нейкіх палітычных партый, то маладзёжныя, прафсаюзныя, ветэранскія арганізацыі там дзейнічаюць», — адзначыў Мікалай Лазавік.

Акрамя таго, размова ішла аб забароне агітацыі, накіраванай на байкот выбараў. Сакратар ЦВК нагадаў прадстаўнікам місіі, што Беларусь далучылася да Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод дзяржаў — удзельніц СНД. «У адпаведнасці з гэтай канвенцыяй байкот забаронены. Прычым гэтая забарона распаўсюджваецца не толькі на выступленні кандыдатаў, але і на ўсіх грамадзян краіны. Інакш кажучы, калі дзяржава траціць вялізныя грошы на арганізацыю і падрыхтоўку выбараў, то грамадзянам забараняецца весці агітацыю за зрыў гэтага найважнейшага мерапрыемства», — сказаў Мікалай Лазавік.

Ацэначная місія БДІПЧ АБСЕ будзе знаходзіцца ў Беларусі да 17 ліпеня.

СТАЛІЦА ВЫЗНАЧЫЛАСЯ З ПІКЕТАМІ

У Мінску вызначаны месцы, забароненыя для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Гэтае рашэнне Мінгарвыканкама ўступае ў сілу з 23 ліпеня і дзейнічае да 21 жніўня 2015 года ўключна, пра што паведамляе прэс-служба сталічнай мэрыі.

Пікетаванне забаронена на аб'ектах метрапалітэна, чыгуначнага і паветранага транспарту, у падземных пешаходных пераходах; на тэрыторыі Кастрычніцкай плошчы, плошчы Незалежнасці, плошчы Перамогі, плошчы Дзяржаўнага сцяга, Прывакзальнай плошчы, плошчы Якуба Коласа; на адлегласці менш як 200 м ад будынкаў рэзідэнцыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў; на адлегласці менш як 50 м ад будынкаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў, судоў, органаў пракуратуры, тэрыторый арганізацый, якія забяспечваюць абараназдольнасць і бяспеку дзяржавы.

Устаноўлена, што пікетаванне з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў можа праводзіцца з 8.00 да 22.00.

Галоўнаму ўпраўленню ўнутраных спраў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта даручана забяспечыць ахову грамадскага парадку ў Мінску ў час збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

ВОЗЬМУЦЦА ЗА ПАДРАДЧЫКАЎ

«Калі ў дачыненні да найбуйнейшых прамысловых прадпрыемстваў прыняты меры, што накіраваны на стабілізацыю фінансава-эканамічнага становішча, то ў дачыненні да падрадных арганізацый прапаноў па вырашэнні існуючых праблемных пытанняў пакуль няма», — адзначыў учора на пасяджэнні Савета Міністраў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ.

У прыватнасці, на пасяджэнні былі заслуханы справаздачы міністра архітэктуры і будаўніцтва, старшыняў аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада па павышэнні эфектыўнасці работы падрадных арганізацый, домабудаўнічых камбінатаў і арганізацый вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Прэм'ер-міністр заўважыў, што ў будаўнічай галіны маецца значная колькасць негатыўных тэндэнцый, якія сёлета толькі пагаршаюцца. Паводле яго слоў, ва ўмовах скарачэння інвестыцыйнай актыўнасці і аб'ёмаў будаўніцтва, высокай закрэдытаванасці арганізацый востра стаяць пытанні выкарыстання створаных і мадэрнізаваных вытворчых магутнасцей будаўнічага комплексу. Андрэй Кабякоў заклікаў членаў урада прааналізаваць існуючыя праблемныя пытанні і падрыхтаваць канкрэтныя прапановы па выхадзе з сітуацыі.

На гэтым пасяджэнні **міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ** паведаміў, што ў нашай краіне кошт квадратнага метра жылля для чаргавікоў не перавышае ўзровень сярэдняй зарплаты з каэфіцыентам 1,2. Ён адзначыў, што цяпер па жыллі з дзяржпадтрымкай гэты каэфіцыент складае 1,08, па астатнім — 1,13. Акрамя гэтага, індэкс будаўніча-мантажных работ сёння амаль на 10% ніжэйшы за індэкс спажывецкіх цэн. «Мы ўзялі на сябе абавязацельствы не дапусціць росту коштаў і будзем утрымліваць будаўнічы комплекс у гэтых межах да канца года», — паабяцаў міністр.

Кіраўнік галіны нагадаў, што летась была завершана мадэрнізацыя домабудаўнічых камбінатаў, пасля чаго прырост вытворчых магутнасцей падвоіўся і склаў 2,440 млн кв.м у год. За 5 месяцаў года выручка арганізацый ад рэалізацыі прадукцыі павялічылася ў 1,3 раза, рэнтабельнасць продажаў вырасла на 3,3%, а чысты прыбытак — у 2,5 раза. «Комплексны падыход да мадэрнізацыі дазволіў аптымізаваць затратную частку і гэтым знізіць кошт квадратнага метра», — растлумачыў Анатоль Чорны. Міністр упэўнены, што сітуацыя ў будаўніцтве жылля пры сённяшняй загрузцы прадпрыемстваў дае магчымасць працаваць рэнтабельна і прыбыткова.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

ДАЙСЦІ ДА ПЯЦІСОТ

Намеснік міністра эканомікі Малдовы Актавіян КАЛМЫК прагназуе павелічэнне тавараабароту паміж яго краінай і Беларуссю да 500 млн долараў, «калі не ў бягучым, то ў 2016 годзе». Пра гэта ён заявіў учора на пасяджэнні Міжурадавай беларуска-малдаўскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў Мінску.

«Нас радуе той факт, што Беларусь, нягледзячы на ўсю кан'юнктуру, якая існуе ў рэгіёне, не прымяняе ніякіх абмежаванняў, тарыфных або нетарыфных бар'ераў у адносінах да малдаўскіх тавараў. Наадварот — прапануе рашэнні па развіцці адносін паміж рознымі гаспадарчымі суб'ектамі», — адзначыў Актавіян Калмык.

Неабходнасць выхаду на больш плённае супрацоўніцтва і павелічэнне аб'ёмаў узаемнага гандлю паміж дзвюма краінамі падтрымаў і **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл РУСЫ**, які ўзначальвае беларускую частку міжурадкамісіі. Ён звярнуў увагу на тое, што калі за апошнія пяць гадоў тавараабарот паміж Беларуссю і Малдовай вырас практычна ўдвая і перасягнуў у 2014 годзе мяжу ў 400 млн долараў, то пяць месяцаў 2015-га дэманструюць некаторую «прабуксоўку». На думку віцэ-прэм'ера, бакам неабходна актывізавацца, прапрацаваць усе вузкія месцы, каб па выніках бягучага года мець тавараабарот хаця б не ніжэйшы за 420-440 млн.

Пра актывізацыю эканамічнага супрацоўніцтва сёння будуць размаўляць і лідары дзвюх краін. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе перамовы з Прэзідэнтам Малдовы Мікалаем Цімафці, які прыбывае ў Беларусь з афіцыйным візітам.

А вось практычны бок узаемаадносін абмяркуюць на беларуска-малдаўскім бізнес-форуме. Удзел у ім возьмуць каля 20 кампаній з Малдовы — з вінаробнай галіны, аграхарчовай прамысловасці, дыстрыб'ютары сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання, будматэрыялаў і іншыя.

Паводле БЕЛТА

ГРОДНА — ПАГРАНПЕРАХОД — ДРУСКІНІНКАЙ

Такім будзе маршрут ужо пятага па ліку міжнароднага марафону дружбы, які яднае суседнія гарады Беларусі і Літвы.

Заяўкі на пераадоленне класічнай марафонскай дыстанцыі працягласцю 42 кіламетры 195 метраў, якая сертыфікавана Міжнароднай федэрацыяй лёгкай атлетыкі, падалі ўжо больш за 240 спартсменаў з 15 краін. Прайшоўшы пагранічны і мытны кантроль у часовай зоне, яны стартуюць раніцай 19 ліпеня каля Лядовага палаца спорту ў Гродне, прабягуць па вуліцах горада і накіруюцца ў бок пагранічнага перахода «Прывалка-Райгардас». Фініш — у цэнтры Друскінінкая.

Удзельнікі марафону падзелены на чатыры ўзроставыя групы — ад 18 да 80 гадоў. Зарэгістраваліся, напрыклад, Яўген Кухімей з Германіі (1938 года нараджэння), Пётр Сілкін з Літвы (1941 г.н.) і Тэнка Лаўры з Фінляндыі (1945 г.н.). Верхні ліміт часу на пераадоленне трасы — 6 гадзін, пасля чаго вынікі бегуноў фіксавацца не будуць. Для параўнання: вынікі мінулагодніх пераможцаў, нашага земляка Сцяпана Рагаўцова і Крысціны Багамягкавай з Украіны, — адпаведна 2 гадзіны 28 хвілін 31 секунда і 3 гадзіны 3 хвіліны 52 секунды.

Усе ўдзельнікі марафону, якія дасягнуць фінішу на працягу кантрольнага часу, атрымаюць медалі. А тых, хто зойме 1-6-е месцы ў абсалютным першынстве сярод мужчын і жанчын, чакаюць грашовыя прэміі. За 1-3-е месцы ва ўсіх узроставых групах узнагародзяць каштоўнымі прызамі.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■ Сітуацыя

«ДАБРАНОМ» ВЫКРУЦІЎСЯ?

Мінгандлю прызначыла гэтай сетцы кантрольную праверку і гатовы выслухаць скаргі пастаўшчыкоў

Не вельмі радасна, калі за нейкія парушэнні часова зачыняюць адну невялікую краму. Зусім іншая справа, калі збіраюцца спыніць дзейнасць усёй вялікай сеткі, дзе больш за сотню магазінаў. Менавіта за даўгі перад пастаўшчыкамі адразу 177 крам сеткі «Дабраном» маглі трапіць у чорны спіс ужо з 21 ліпеня.

Кіраўніцтва гандлёвай сеткі адрэагавала аператыўна і ўжо 14 ліпеня аб'явіла аб поўным пагашэнні пратэрмінаванай запазычанасці перад пастаўшчыкамі за кошт выручкі сваіх крам. Цяпер адміністрацыя гэтай вядомай сеткі спадзяецца, што Мінгандлю адменіць рашэнне аб прыпыненні дзейнасці ўсіх іх крам у трэцяй дэкадзе ліпеня. У Міністэрстве гандлю працуюць зусім не крыважэрныя людзі, таму там часткова пайшлі насустрач і прызначылі кантрольную праверку ліквідацыі парушэнняў, у тым ліку ў частцы забеспячэння своечасовасці разлікаў. Мінгандлю таксама прапанавала пастаўшчыкам тавараў у «Дабраном» пры наяўнасці фактаў пратэрмінаванай запазычанасці паведаміць да 17 ліпеня ў міністэрства па тэлефоне (017) 327-25-97 з прадстаўленнем пацвярджальных дакументаў.

Прадстаўнікі органаў дзяржкіравання адзначаюць, што настойлівая пазіцыя Мінгандлю дазваляе зняць вастрыню праблемы разлікаў гандлёвых сетак з пастаўшчыкамі. **Прадстаўнік «Белдзяржхарчпрама» Міхаіл СВЯНЦІЦКІ**, у прыватнасці, на нядаўняй нарадзе адзначыў: «Калі месяц таму дэбіторская запазычанасць складала больш за 80 млрд рублёў, то цяпер яна скарацілася на 36 млрд, што можна назваць сур'ёзным крокам па вырашэнні гэтай праблемы». Ён заявіў аб недапушчальнасці таго, што сёння на спажывецкім рынку сеткавыя аператары дыктуюць жорсткія ўмовы пастаўшчыкам.

Нагадаю, што на момант папярэдняй праверкі сеткі «Дабраном» пратэрмінаваная запазычанасць арганізацыі за пастаўленыя тавары, у тым ліку мяса, малако і хлеб, перавышала 30 млрд рублёў.

Кіраўнік згаданага прадпрыемства Васіль ЯКУБАЎ удакладніў, што праблемы з разлікамі маюць кароткачасовы характар. У падобных сітуацыях кампанія раней прыцягвала кароткатэрміновыя банкаўскія крэдыты для пагашэння запазычанасцей. «На момант вынясення рашэння Мінгандлю аб прыпыненні працы ўсіх крам у «Дабранома» была дамоўленасць з 3 банкамі і буйной лізінгавай кампаніяй аб выдзяленні крэдытных сродкаў. Аднак пасля рашэння аб прыпыненні працы сеткі нашы партнёры прыпынілі перамовы аб крэдытаванні да канчатковага рашэння Мінгандлю», — растлумачыў Васіль Якубаў.

У прыватнасці ён паведаміў, што «Дабраном» і без праверкі Мінгандлю абавязкова аплаціў бы ўсе кантракты на пастаўку тавараў. Кіраўнік кампаніі запэўніў, што «ніколі за пяць гадоў працы сеткі не было запазычанасці ні перад бюджэтам, ні па заработнай плаце, ні перад банкамі. Запазычанасць перад пастаўшчыкамі, калі і была, то мела кароткатэрміновы характар».

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Ці чулі?

МЯСА «З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ»

Апошнім часам з'яўляецца ўсё больш прадукцыі з выкарыстаннем нацыянальнага арнаменту: футболкі, кашулі, гадзіннікі... Днямі шэраг такіх прадметаў папоўніла... рашотка для грыля. Такую прыладу з каваным арнаментам выпусціла вядомая кампанія, якая займаецца вытворчасцю алкагольных напояў.

Ідэя стварэння «выкаванкі» (менавіта так назвалі навінку) з'явілася ў сацыяльных сетках. У працэсе смажання мяса на страве будуць адбівацца ўзоры з рашоткі. Першая партыя з дзесяці асобнікаў выканана ўручную з металу і дрэва. Вытворцы паведамляюць, што такім крокам яны падтрымліваюць цікавасць спажыўцоў да нацыянальных сімвалаў і культуры. У кампаніі абяцаюць, што калі навінка атрымае папулярнасць, то рашотка з арнаментам будзе запушчана ў серыю. Мяркуецца, што «выкаванка» можа стаць адным з турыстычных сімвалаў Беларусі.

— Мне такая інтэрпрэтацыя падаецца вельмі сумніўнай, — лічыць **этнакультуролаг Янка КРУК.** — Бо, па-першае, арнамент — гэта вельмі сакральны сімвал, які ўжываўся на знакавых прадметах — на адзенні, ложку, у аздабленні вокнаў. А па-другое, кожны ўзор мае свой сэнс. Калі на грылі размешчаны «васьмірог», то я не разумею, што хацелі сказаць гэтым вытворцы. Бо васьміканцовая зорка сімвалізуе сабой каляндар, асноўныя славянскія святы. Можа, так гэта кампанія і тлумачыць, маўляў, прыйшло свята — даставай пляшку?.. Таму я стаўлюся да такой задумы негатыўна.

Тавараў з «нацыянальным каларытам» у нас сёння ці не зашмат. І гэта, безумоўна, добра, бо як-ніяк абуджае цікавасць да нашай гісторыі і агульнай спадчыны. А ўжо ці дазваляць народным каштоўнасцям знаходзіцца на

кавалку мяса ці на ніжняй бялізне — справа адукаванасці і павагі да традыцый і гісторыі саміх спажыўцоў, гэта значыць, нас з вамі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■

■ Добрая навіна

І ЧЫПСЫ НЕ ПЕРАШКОДЗЯЦЬ ГЛЯДЗЕЦЬ КІНО Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

Арт-кінатэатр расчыніў учора свае дзверы для гледачоў на праспекце Дзяржынскага ў Мінску.

Арт-кінатэатр мае дзве кіназалы: вялікую і малую. У вялікай зале размяшчаецца 225 месцаў, у малой — 120. Тут ёсць дзве катэгорыі сядзенняў для гледача — звычайныя месцы, дзе размешчана камфортная мэбля з падлакотнікамі, і VIP-месцы — канапы, якія прадаюцца як асобнае месца.

— Недалёка ад нас знаходзіцца кінатэатр «Бярэсце», але ў нас добрасумленная канкурэнцыя. Канкурэнцыі, у прынцыпе, баяцца не варта, паколькі ў кожнага кінатэатра ёсць свая мэтавая аўдыторыя. Таму мы спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час знойдзем свайго гледача, які будзе любіць нас, мы будзем любіць яго, і нам будзе зручна працаваць, — паведаміла **намеснік дырэктара па маркетынгу Наталля ДЗЯМЧУК.**

Акрамя вентыляцыйнай сістэмы, у кіназалах усталяваны кандыцыянеры: 3 — у вялікім і 2 — у малым. У фае размешчаны бар, дзе можна купіць папкорн, чыпсы, напоі. Дарэчы, прадукты прадаюцца ў бясшумных упакоўках, каб не ствараць нязручнасці гледачу, які сядзіць побач.

Акрамя сусветных прэм'ер, тут будуць праходзіць тэматычныя вечары, арт-кіно, прымеркаваныя да якой-небудзь падзеі.

Кошт квітка залежыць ад сеанса, катэгорыі месца і прэм'ернага фільма. Напрыклад, раніцай цана складае 30 000 рублёў, днём — 40 000 рублёў, вечарам — 50 000 рублёў, VIP-месцы ў любы час — 200 000 рублёў.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

КУРОРТЫ ПАВЫШАНАЙ НЕБЯСПЕКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праўда, на выбар беларусамі курорта сітуацыя не надта паўплывала. Змяншэнне турыстычнага патоку на гэтым напрамку — 15-20 працэнтаў (для параўнання: продажы пуцёвак у Егіпет у 2011 годзе з прычыны беспарадкаў у рэгіёне ўпалі ў два разы, а паток ва Украіну летась знізіўся ў тры разы). Устойлівую цікавасць да Туніса турфірмы тлумачаць унікальнасцю напрамку і адсутнасцю альтэрнатывы: па коштах тое ж самае, што Егіпет ці Балгарыя, але культурная праграма і ўмовы зусім іншыя. Хаця адмовы ад паездак ёсць (па мерках аператаў, гэта адзінкі). У Дэпартамент па турызме штодзень тэлефануе 4-5 чалавек, якія хочуць памяняць краіну адпачынку ці вярнуць грошы за тур. Нядаўна, напрыклад, прыходзіла група урачоў, 24 чалавекі: калектыў цалкам адмовіўся ад паездкі на Міжземнамор'е.

У спісе неспрыяльных для турызму краін сёлета не толькі Туніс. Некаторыя дзяржавы Аравійскага паўвострава і Далёкага Усходу таксама ў шэрагу небяспечных. Прычына — каранавірус. Сусветная арганізацыя аховы здароўя і Міністэрства аховы здароўя адсочваюць сітуацыю ў рэгіёнах, дзе былі ўспышкі захворвання. Аматарам падарожжаў раяць часова адкласці паездкі ў Паўднёвую Карэю, Манголію, Кувейт, Саудаўскую Аравію і нават у любімыя многімі турыстамі Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.

Нашым людзям, якія грошы на адпачынак прывыклі збіраць на працягу цэлага года, адмовіцца ад тура ў многім не дае фінансавы складнік.

— Кошт пуцёўкі цалкам, верагодна, вярнуць будзе немагчыма, таму што агенцтва на гэтыя сродкі браніруе гасцініцу, набывае білеты. Аднак мы просім кампаніі ісці на кампрамісы з турыстамі і рабіць захады па змяншэнні расходаў людзей, — кажа **галоўны юрысконсульт аддзела маркетынгу і якасці турыстычных паслуг Дэпартамента па турызме Аляксандр КРЭЧАТАЎ.**

Калі чалавек адмаўляецца ад пуцёўкі, фірма павінна вярнуць яе кошт за вылікам рэальных расходаў. Аператару ў распісцы трэба пазначыць не толькі суму, але і яе падрабязную расшыфроўку: столькі аддалі за нумар у гатэлі, столькі — за трансфер і паслугі гіда, у якога ўжо распланавана суправаджэнне груп. Зразумела, чым большы прамежак часу застаецца да пачатку падарожжа, тым вышэйшая вераграднасць атрымаць свае грошы назад (бо ў агенцтва яшчэ ёсць магчымасць рэалізаваць гэты тур). Калі паездка адбудзецца толькі праз два-тры месяцы, кампаніі могуць вярнуць да 90 працэнтаў кошту пуцёўкі. Розныя штрафныя санкцыі, якімі часам пужаюць турыстаў, — прыдумкі аператараў. Згодна з беларускім заканадаўствам, нельга ўтрымліваць з кліента, які адмаўляецца ад тура, нейкія працэнты звыш фактычных расходаў.

— Многія фірмы зараз кажуць, што патрэбна афіцыйная заява ад дзяржаўных органаў, каб была падстава для вяртання грошай. На самай справе, падставай з'яўляецца заданне заказчыка. Не мае значэння, з якой прычыны ён вырашыў не ехаць у падарожжа, — каментуе юрыст.

Увогуле, інфармацыя, звязаная з эпідэміямі, катастрофамі, неспрыяльным становішчам у краіне, — першае, што агенцтву неабходна даводзіць да турыста. Калі чалавек едзе адпачываць асобна, то перад тым, як заключыць дагавор, ён павінен атрымаць у фірме інструктаж. У выпадку з групавымі турамі правілы паводзін у тых ці іншых сітуацыях распісвае на пачатку падарожжа кіраўнік групы. Дарэчы, калі чалавек ужо паехаў у Туніс, але цяпер адчувае пагрозу свайму жыццю і хоча пакінуць краіну, ён можа праз кіраўніка групы звязацца з кампаніяй, каб тая арганізавала яму вяртанне ў Беларусь. Прычым вяртанне павінна ажыццяўляцца на тых жа умовах, на якіх турыст ехаў на курорт.

У дэпартамент зараз паступаюць пытанні наконт таго, ці будзе забаронены выезд нашых грамадзян у Туніс. Па словах Аляксандра Крэчатава, спыніць турыстычны паток на Міжземнамор'е з прычыны таго, што там адбываюцца тэрарыстычныя акты, міністэрства не можа. Ёсць закон аб парадку выезду і ўезду грамадзян Беларусі, дзе выразна прапісаны падставы для абмежавання правоў на выезд, і сітуацыя з Тунісам пад іх не падпадае. Тут ужо турыст вырашае самастойна: адмовіцца ад пуцёўкі на карысць больш бяспечнага курорта ці рызыкнуць і адправіцца па запланаваным маршруце.

lubneuskaya@zviazda.by

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Фота Івана КУПАРВАСА.

БЯЛІЗНА І ПОСУД ЯК ПРЫКРЫЦЦЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гэтай гісторыі канец шчаслівы: бабуля хутка спахапілася, і ўсіх трох міліцыя затрымала яшчэ да таго, як яны паспелі патраціць грошы (пакуль купюры — рэчавы доказ, але потым іх вернуць пенсіянерцы). Старая апазнала зламысніц (іх узрост — 21, 22 і 28 гадоў), а вынікі экспертыз пацвердзілі, што менавіта гэтыя жанчыны абакралі пенсіянерку. Цяпер махляркі знаходзяцца пад вартай.

Па словах **афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандра ГЕРАСІМАВА**, гэты выпадак не адзінкавы. Апошнім часам падобныя злачынствы здзяйсняліся ў розных раёнах сталіцы. Да пенсіянераў, якія адзінока пражываюць, махляры прыходзяць пад выглядам газавікоў, сацыяльных работнікаў, прадстаўнікоў ЖЭС і крадуць грошы і іншыя каштоўнасці. А напярэдадні, каб «аціць становішча», патэнцыйных ахвяр наведваюць прадаўцы посуду і пасцельнай бялізны.

Лета для такіх ашуканцаў — «ураджайная» пара. Гараджане на адпачынак з'язджаюць на мора ці на лецішчы, і старыя бацькі на колькі тыдняў застаюцца адны. Пажылых родзічаў варта папярэдзваць аб падобных выпадках, каб тыя былі больш пільныя. Калі ў кватэру настойліва просіцца незнаёмы электрык ці сацработнік, трэба праверыць інфармацыю: патэлефанаваць у названую арганізацыю і спытаць, ці не накіроўвалі яны спецыяліста па дадзеным адрасе. Інфармацыю пра зламыснікаў добра было б змяшчаць на жыроўках ці стэндах у паліклініках — там, дзе пенсіянеры дакладна яе заўважаць.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Май на ўвазе!

ГРАШОВЫХ ФАЛЬШЫВАК СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ

За першае паўгоддзе 2015-га ў Беларусі зарэгістравалі на 22,3% больш фактаў фальшываманецтва, чым за аналагічны перыяд летась, пра што паведамілі ў прэс-службе Міністэрства ўнутраных спраў.

Для правапарушэння збольшага выбіралі амерыканскія долары (252 факты). Амаль траціна прыпадае на расійскія рублі (137), крыху больш за 11% — на еўра (53), каля 5% (25) — на беларускія рублі. Праваахоўнікі выявілі тры факты збыту падробленых кітайскіх юаняў, адзін — украінскай грыўні.

Між іншым, супрацоўнікі падраздзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі з абароту канфіскавалі 1136 падробленых банкнот: 826 — долары ЗША, 183 — расійскія рублі, 87 — еўра, 36 — беларускія.

У «топе» сярод падробленых грошай — банкноты наміналам 100 долараў, 5 тысяч расійскіх рублёў, 100 і 50 еўра, 50 і 200 тысяч беларускіх рублёў. Найбольшая колькасць фальшывых грошай увезена ў краіну з Расіі, Літвы, Польшчы і Украіны.

Час ад часу грамадзяне жадаюць абмяняць сувенірныя грошы: за першае паўгоддзе зарэгістравана 116 падобных выпадкаў. Варта памятаць, што на вырабах, якія імітуюць долары ЗША, маецца тэкст «Не з'яўляецца плацежным сродкам», на расійскіх рублях — «Білет банка прыколаў» ці «Не з'яўляецца плацежным сродкам», на банкнотах еўра — «Souvenir Production».

Міністэрства ўнутраных спраў раіць грамадзянам праводзіць усе валютныя аперацыі ў спецыяльна прызначаных для гэтага установах, не купляць валюту з рук і не ўдзельнічаць у сумнівных здзелках.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■

ЗБЯРОМ ПАРТФЕЛЬ ПЕРШАКЛАСНІКУ

Дабрачынная акцыя «Партфель першакласніка» стартавала ў Мінску, пра што паведамілі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.

Дапамагчы малазабяспечаным і шматдзетным сем'ям сабраць дзяцей у школу можна да 25 жніўня ў буйных гандлёвых пунктах сталіцы (ГУМе, ЦУМе, універмагах «Беларусь» і «Кірмаш», у гандлёвым доме «На Нямізе»). Прыняць удзел у акцыі можа кожны ахвотны: у адным з гэтых магазінаў трэба купіць школьныя прылады, прызначаныя для будучых першаклашак. Валанцёры перададуць падарункі ў «Беларускую асацыяцыю шматдзетных бацькоў». Акрамя таго, можна пералічыць грашовыя сродкі на разліковы рахунак Мінскай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў»: р/с 3015000000307 у ААТ «Беларусбанк», г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 18, код 975, УНП 100534074 з пометкай «Партфель першакласніка». Партфелі, напоўненыя дабрачыннымі падарункамі, уручаць дзецям 26 жніўня ў кінатэатры «Піянер».

Надзея ПАЎЛАВА, Святлана БУСЬКО.

БПС-СБЕРБАНК

С 16.07.2015 ОАО «БПС-Сбербанк» снижает размер процентов по заключенным с 30.12.2014 по 31.12.2014 (включительно) договорам в долларах США и евро срочного банковского депозита «Доверяй+» с действующей процентной ставкой 8,0% и 8,5% на 1,8 п.п. и 2,3 п.п. соответственно – до 6,2% (годовых).

Установленный размер процентов будет применен с 16.08.2015 года.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по единому короткому номеру 148.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

■ Не прапусціце!

УЛАДАРЫ ПАВЕТРА

На працягу трох дзён — з 17 па 19 ліпеня — у небе над Мінскам будзе гаспадарыць першы ў краіне фестываль авіяцыйнага спорту

Старшыня Беларускай федэрацыі авіяцыйнага спорту Аляксандр ЦЭНЦЕР паведаміў, што грандыёзнае для краіны мерапрыемства збярэ амаль 200 спартсменаў з усяго свету і можа трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса па колькасці паветраных шароў над сталіцай дзяржавы.

У гэты час Мінск чакае Міжнародны кубак па паветраплавальным спорце, верталётныя гонкі, авіяшоу, масавы парашутны дэсант, «дзіцячы дзень» і многае іншае. У неба паднімецца да 70 паветраных шароў планеты. І, калі дазволяць ветравыя ўмовы, будзе зафіксаваны рэкорд, годны Кнігі рэкордаў Гінеса, бо яшчэ ні над адной сталіцай свету столькі аэрастатаў адначасова не пралятала.

Першы фестываль авіяцыйнага спорту ў Беларусі атрымаў сімвалічную назву «70 гадоў мірнага неба» ў гонар Вялікай Перамогі. Мерапрыемства сумясціць у сабе відовішчны адпачынак і міжнародныя спаборніцтвы з удзелам спартсменаў з 8 краін свету.

БУДЗЕМ ЛІЧЫЦЬ «ШАРЫКІ»

У гэтыя тры дні аэрастаты будуць узлятаць з некалькіх пляцовак у Мінску (плануюцца аэрапорт Мінск-1 і аэрадром Баравая) і ляцець па кірунку ветру. Увогуле, паветраплавальная частка фестывалю складаецца са спаборніцтваў за Міжнародны кубак па паветраплавальным спорце, па выніках якіх будуць вызначаны пераможцы ў міжнародным і нацыянальным заліках, і «фіесты» — яркага паказальнага шоу з удзелам цеплавых аэрастатаў і аэрамадэляў.

Пілоты, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах, выконваюць спартыўныя заданні, а пілоты з паказальнай праграмы проста цешаць гледачоў. На дадзены момант аб удзеле ў спаборніцтвах заявілі 46 пілотаў, агульная колькасць каманд аэрафестывалю — каля 70. Калі ўсе гэтыя 70 «шарыкаў» праляцяць над Мінскам, то гэта і будзе наш рэкорд. Збоку адрозніць шар спартсмена і ўдзельніка «фіесты» амаль немагчыма, таму абедзве праграмы будзе адналькава цікава назіраць з зямлі.

ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА ЧУЖЫХ І «ПАХВАРЭЦЬ» ЗА СВАІХ

На фэсце чакаюцца аэранаўты з Беларусі, Германіі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны і нават з Новай Зеландыі. Папярэдне на спаборніцтвы ў Мінску заявіліся чэмпіёны Расіі і Украіны, удзельнікі чэмпіянатаў свету і Еўропы.

Спартыўная праграма па паветраплаванні складаецца з 4 вылетаў. У кожным палёце трэба выканаць заданні, пра якія пілоты дазнаюцца напярэдадні. Напрыклад, прыляцець у паказаную кропку, зрабіць паварот у небе (што без рухавіка вельмі складана), прайсці пэўную дыстанцыю ў зададзены час.

Старты аэрастатаў залежаць ад надвор'я. Увечары 17 ліпеня, раніцай 18 і 19 ліпеня плануецца старт з тэрыторыі аэрапорта Мінск-1. Увечары 18 ліпеня аэрастаты і аэрамадэлі ўдзельнічаюць у маштабным авіяцыйным свяце «70 гадоў мірнага неба» на аэрадроме «Баравая».

Спецыяльны спартыўны паказальны палёт плануюць здзейсніць у пятніцу з пляцоўкі аэрапорта «Мінск-1» прыкладна з 18.00 да 20.00. Такім чынам, у суботу спартыўныя палёты плануюцца з пляцоўкі Мінск-1 з 6 да 8 гадзін раніцы, а з аэрадрома «Баравая» спартыўныя і паказальныя палёты з 18.30 да 20.00. У нядзелю раніцай (6.00—8.00) спартыўны палёт і палёт «фіесты» павінны адбыцца з пляцоўкі «Мінск-1».

ПРА ТАКОЕ НЕЛЬГА ЗАБЫЦЦА

У рамках авіяцыйнага фестывалю на аэрадроме «Баравая» ўвечары 18 ліпеня плануецца адначасовы ўздым усіх удзельнікаў фіесты і спаборніцтваў паветраплавальнікаў.

Таксама ў суботу, калі добра сцямнее (22.00—23.00), жыхарам сталіцы пакажуць самае прыгожае відовішча — начное свячэнне паветраных шароў у небе Мінска (папярэдне — каля стэлы «Мінск — горад-герой»). Арганізатары фестывалю ўпэўнены, што ўражлівае шоу не пакіне абыякавым ніводнага мінчаніна і госця сталіцы. Дарэчы, уваход на ўсе мерапрыемствы першага авіяфестывалю вольны.

З ЧАЛАВЕКАМ І БЕЗ

У фестывалі ўдзельнічаюць пілоты цеплавых аэрастатаў і каманды аэрамадэляў. А вось у спаборніцтвах за Кубак — толькі пілоты цеплавых аэрастатаў. Цеплавы аэрастат — гэта паветраны шар, напоўнены простым паветрам. Ён кіруецца па вертыкалі з дапамогай нагрэву і астуджэння паветра. Пілотам з'яўляецца камандзір паветранага судна, у яго ёсць памочнікі, напрыклад, штурман. Аэрамадэль уяўляе сабой паменшаную копію сапраўднага паветранага шара, толькі ў кошыку замест пілота — аўтаматыка, якой кіруюць па рацыі.

САМАЯ ГУЧНАЯ ПАДЗЕЯ ЛЕТА

Верталётныя гонкі стануць адной з цэнтральных падзей фестывалю авіяцыйнага спорту. Падобныя спаборніцтвы праводзяцца ў Беларусі ўпершыню. У небе над «Баравой» сустрэнуцца 16 наймацнейшых экіпажаў з Беларусі, Расіі і Украіны, чэмпіёны і прызёры найбуйнейшых міжнародных спаборніцтваў. Гонкі пройдуць на верталётах Mi-2 і Robinson R44 на вышыні ад 3 да 10 метраў над зямлёй. Авацыі гледачоў павінны быць вельмі гучнымі, каб спартсмены пачулі іх за шумам лопасцей.

СЛАЛАМ І ФРЫСТАЙЛ

Галоўны прынцып такіх гонак — відовішчнасць пры захаванні максімальнай бяспекі гледачоў і ўдзельнікаў спаборніцтваў. Праграма складаецца з трох дысцыплін: «развозка грузу», «слалам» і «індывідуальны фрыстайл». Верталёты парамі выконваюць аднолькавыя заданні на паралельных пляцоўках. Спаборніцтвы праходзяць па алімпійскай сістэме на выбыванне, ад чвэрцьфіналаў да захапляльных паўфіналаў і фінальных паядынкаў.

Пры «развозцы грузаў» экіпажы з двух чалавек спаборнічаюць у дакладнасці праходжання маршруту з грузам, прымацаваным да фала. У той час, як камандзір верталёта адказвае за напрамак палёту, другому члену каманды трэба пранесці груз на фале праз вароты і апусціць паслядоўна ў тры кантэйнеры. У дысцыпліне «слалам» верталёты праносяць па маршруце вядро, прымацаванае да каната і напоўненае вадой, праз вароты ў пэўнай паслядоўнасці. На фінішы неабходна паставіць вядро на стол. Суддзі ацэньваюць час, дакладнасць і захаванасць вады ў вядры.

Індывідуальны фрыстайл павінен прадэманстраваць максімальную манеўранасць верталёта і вельмі высокі ўзровень лётнага майстэрства пілотаў. У сваіх чатырохвілінных праграмах удзельнікі могуць выкарыстоўваць нават музыку, каб узмацніць уражанне ад выступленняў.

Верталётныя гонкі плануецца правесці ў суботу на аэрадроме «Баравая» з 13.00 да 18.00. А за 30 хвілін да гэтага там будуць паказальныя скачкі парашутыстаў, у тым ліку масавы дэсант з 24 чалавек.

САЧЫЦЬ АСАБЛІВА ПІЛЬНА

У небе над «Баравой» пазмагаецца не менш за 30 спартсменаў-верталётчыкаў з Беларусі, Расіі і Украіны.

Ад Беларусі ўдзельнічаюць 3 экіпажы на верталёце Mi-2 і экіпаж на Robinson R44. Свае здольнасці пакажуць Уладзімір Стрыёнак і Аляксандр Цэнцер (старшыня Беларускай федэрацыі авіяцыйнага спорту), для якога гэтыя верталётныя гонкі стануць першымі ў яго спартыўнай кар'еры. Праявяць сябе таксама больш вопытныя спартсмены Аляксей Мачанскі і Антон Данчанка. Прадэманструе сваё майстэрства Валерый Яляеў, якому няма роўных у Беларусі ў дысцыпліне «фрыстайл».

Малая авіяцыя яшчэ і прыгожая.

З ПРЫЦЭЛАМ НА ДУБАЙ

«Мы разлічваем, што авіяфестываль не толькі прыцягне тысячы гледачоў, але таксама дазволіць павялічыць колькасць маладых людзей, якія жадаюць стаць спартсменамі. Разлічваем адшукаць і новых партнёраў, якія паспрыяюць развіццю спорту і стварэнню адпаведнай інфраструктуры ў нас у краіне, — кажа **генеральны сакратар Беларускай федэрацыі авіяцыйнага спорту Антон БЫСТРОЎ**. — Цяпер нацыянальная зборная рыхтуецца да Сусветных авіяцыйных гульняў у Дубаі, і мы разглядаем гэтае мерапрыемства як этап падрыхтоўкі да іх».

Дарэчы, галоўная падзея ў свеце авіяспорту — Сусветныя авіяцыйныя гульні, якія адбудуцца ў пачатку снежня ў ААЭ (Дубай). Штогод беларускія спартсмены паднімаюцца на п'едэстал найбуйнейшых міжнародных спаборніцтваў, пацвярджаючы статус наймацнейшых у авіяцыйных відах спорту. Сёння прадстаўнікамі Міжнароднага алімпійскага камітэта нават разглядаецца магчымасць уключэння асобных відаў авіяцыйнага спорту ў праграму Алімпіяды-2024.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Сталічны час

ВЕРХНІ ГОРАД МОЖА СТАЦЬ ПЕШАХОДНЫМ

А ў прыватным сектары дазволяць ажыццяўляць мадэрнізацыю

Такую ідэю агучыў галоўны архітэктар Мінска Павел ЛУЧЫНОВІЧ падчас тэлефоннай прамой лініі з жыхарамі горада. Людзі ўзнялі праблему наплыву аўтамабіляў у цэнтры Мінска — на вуліцах Рэвалюцыйнай, Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай, дзе машыны часцяком прыпаркаваны ў некалькі радоў, што, безумоўна, псуе гістарычнае аблічча сталіцы.

Спецыяліст упэўнены, што Верхні горад у найбліжэйшы час варта зрабіць пешаходным, як гэта практыкуецца ў многіх еўрапейскіх гарадах. На яго думку, мінскім уладам у гэтым плане будзе цікавы маскоўскі вопыт, бо ў расійскай сталіцы зараз праводзіцца каласальная работа па стварэнні пешаходных зон. А ў Паўднёва-Усходняй акрузе Масквы, напрыклад, нават плануецца працягнуць зону платнай паркоўкі да МКАД. Такім чынам атрымаецца не толькі разгрузіць цэнтр, але і зарабіць дадатковыя сродкі, якія накіруюць на капітальны рамонт дамоў і добраўпарадкаванне тэрыторыі.

ПРЫЯРЫТЭТ — ГРАМАДСКАМУ ТРАНСПАРТУ

Перспектыўным напрамкам у вырашэнні праблемы з паркоўкай, паводле слоў Паўла Лучыновіча, з'яўляецца таксама выдзяленне спецыяльных палос для грамадскага транспарту. Іх з'яўленне «адцягне» частку легкавых машын з цэнтра, бо перавагу руху ў такім выпадку атрымаюць аўтобусы і тралейбусы. Акрамя таго, гэта прастымулюе мінчан аддаць перавагу гарадскому транспарту, а не асабістаму аўто.

Дарэчы, крыху раней Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка ўжо аб'явіла аб сваіх планах стварыць у сталічных дварах у другім паўгоддзі 1260 дадатковых парковачных месцаў і разваротных пляцовак. «Зразумела, што рашэнне пытання па «вызваленні» цэнтра горада ад машын патрабуе комплекснага падыходу, які Мінску яшчэ трэба будзе выпрацаваць», — рэзюмаваў Павел Лучыновіч.

ДУБЛЬ ДВА?

Варта прыгадаць, што ў сталіцы ўжо стваралі пешаходную зону на вуліцы Карла Маркса. Некалькі гадоў таму яна была пешаходнай па выхадных з мая па верасень. У планах нават было да 2014 года зрабіць гэтую вуліцу пешаходнай заўсёды, а не толькі па святах. Мінчане вельмі хутка прывыклі да магчымасці па выхадных пасядзець у вулічнай кавярні, паслухаць самых розных па стылістыцы музыкаў і паглядзець тэатралізаваныя паказы. Планавалася, што пешаходнай з часам стане і вуліца Камсамольская. Але цяпер, як бачым, «пешаходная» ідэя будзе рэалізоўвацца ў Верхнім горадзе.

НЕ БУДЗЕ ТАТАЛЬНАГА ЗНОСУ

Старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінскага гарвыканкама спыніўся і на пытаннях тэрмінаў зносу жылля, прадугледжанага праграмай рэканструкцыі тэрыторыі малапавярховай жылой забудовы. Спадар Лучыновіч паведаміў, што цяпер мінскія горадабудаўнікі адмовіліся ад перспектывы татальнага зносу прыватнага сектара. Быў узяты на ўзбраенне дыферэнцыраваны падыход: гарадское асяроддзе павінна быць разнастайным, таму фарміраваць яго будуць не толькі вышынныя дамы, але і сядзібная забудова.

Галоўны архітэктар горада нагадаў, што раней у Мінску дзейнічала татальная забарона на рэканструкцыю і мадэрнізацыю раёнаў індывідуальнай жылой забудовы. Аднак жыццё ўносіць свае карэктывы, і зараз зносіць вялікую колькасць прыватных дамоў для горада нярэдка эканамічна немэтазгодна і вельмі складана. Менавіта таму прынята рашэнне часткова зняць такую забарону. Разам з тым, гэта не закране ўчасткі, якія ў будучыні падпадаюць пад будаўніцтва магістраляў, а таксама прымагістральных тэрыторый, што будуць фарміраваць сталічнае аблічча.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

Сэрцу Мінска «жалеза» больш не патрэбна.

Сямейная газета

Выпуск № 11 (34)

НЕ СТАМЛЯЙЦЕСЯ ЗДЗІЎЛЯЦЬ

Не так даўно са знаёмай абменьваліся думкамі наконт выхавання дзяцей. Сышліся на тым, што гарантый шчасця няма: ніколі не ўгадаеш, кім вырасце твая крывіначка. Але гэта і добра. Пагадзіцеся, не цікава было б жыць, калі б шчасце было гарантавана. Ніякай прасторы для эксперыментаў. У мяне пакуль, у адрозненне ад Рымачкі, няма Сцяпана, але разумею, што выхаванне дзіцяці — гэта надзвычай творчы працэс.

З захапленнем назіраю, як выхоўвае сваіх дзяўчынак яшчэ адна знаёмая маладая мама. Наташа (гэта так кранальна!) завяла «каробкі дзяцінства» для кожнай з дачок. Не ведаю дакладна, што яна там захоўвае, але, мяркую, што бірачкі з раддома, першы выпаўшы зуб, сукеначку, у якой хрысцілі, першы малюнак... Усё, што лічыць важным і памятным. А на днях у сацыяльных сетках з'явіўся яе новы пост: «Зрабілі з дзеткамі партрэты членаў нашай сям'і. Партрэты па рэчах. Спачатку выклалі на падлозе рамку з алоўкаў. А потым шукалі ў доме ўсё, што нас характарызуе. Цікава было назіраць, як дочкі ствараліі мамін і татаў партрэты... «Тата любіць чытаць, жонку і гуляць з намі... Яшчэ любіць варыць кашу і пыласосіць... Так «любіць жонку» паклалі, што яшчэ?» — чулася з пакоя...»

Тое ж і з узаемаадносінамі мужа і жонкі. Яны, пераканана, патрабуюць не менш творчага падыходу. Можна, вядома, скласці рукі, маўляў, няхай цячэ, як цячэцца. Але тады не трэба здзіўляцца, чаму спяшацца з працы дадому (у аднатыпнасць і будзённасць) нікому не хочацца.

У маёй былой аднакурсніцы і яе мужа ёсць цудоўная сямейная традыцыя, якую раю пераняць усім, незалежна ад колькасці сумесна пражытага і перажытага «Спатканне ўсляпую». Яе сутнасць у тым, што адзін з пары ведае пра гэтае спатканне ўсё, другі — нічога, акрамя даты і часу. Пры гэтым месца і ідэя сустрэчы павінны быць нечаканымі. Можна, напрыклад, звадзіць мужа ў цырк (калі ён не быў там з дзяцінства), як зрабіла Насця, ці адкрыць для жонкі-мінчанкі, як зрабіў Жэня, невядомы дагэтуль Мінск. «Ператварыць свой дзень у нешта яркае, неардынарнае, запамінальнае вельмі проста. І як рэдка, пры ўсёй даступнасці, гэта робяць людзі вакол, — піша Насця ў сямейным блогу. — Зараз, калі нас двое, мы радуем адно аднаго. Пазней такімі ж рэчамі абавязкова будзем радаваць сваіх дзяцей. Бо нішто ў дзяцінстве не запамінаецца лепш, чым мілыя бацькоўскія традыцыі накшталт «кожнае 1 верасня тата купляў мне кавун» або «ў чэрвені ў нашай сям'і спаборніцтва па зборы чырвонагаловікаў...»

У сямейным жыцці, як і ва ўсім, ніколі нельга спыняцца. І ненавацца. Памятайце пра гэта. І не стамляйцеся здзіўляцца і здзіўляць адно аднаго. Гэта не толькі надасць вастрыні і цікавасці сямейнаму баўленню часу, але і дапаможа захаваць свежасць пачуццяў. Каб нават праз мноства гадоў адчуваць тое ж хваляванне, што ў самым пачатку.

Надзея ДРЫЛА.
dryla@zviazda.by

«МОЙ ТАТА ПАЎ-КОЎ-НІК!»

Залацістыя наплечныя знакі з трыма вялікімі зоркамі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны атрымалі праваахоўнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Цяпер ужо палкоўніка Аляксандра ПРАХАРЭНКУ, намесніка начальніка Цэнтральнага РУУС сталіцы (на фота), прыйшлі падтрымаць жонка Алеся і маленькая дачка Елізавета.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

— Мы вельмі спадзяваліся, што Саша стане палкоўнікам, — прызнаецца жанчына. — Разам з тым, пэўная доля адказнасці ўскладаецца і на сям'ю. Акрамя гонару, мы адчуваем, што ў нашага таты цяпер будуць новыя турботы. Будзем падзяляць усё разам з ім.

— А дачка ўжо ведае, што яе тата міліцыянер?

— Безумоўна, і яна ўсім расказвае пра гэта. А цяпер яшчэ кажа, што яе бацька палкоўнік. Ліза, хто твой тата? — нахіляецца да дачкі маці.

— Мой тата Паў-коў-нік! — з усмешкай кажа дзяўчынка і праз некалькі секунд адбягае фатаграфавацца разам з бацькам.

А вось Сяргей Волкаў прыехаў на ўрачыстасць з Магілёва.

— Пагоны, якія прысвоены паводле ўказа Прэзідэнта, уручаў міністр, а таму яшчэ да пачатку мерапрыемства было хвалююча, — кажа **намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі УУС Магілёўскага аблвыканкама Сяргей ВОЛКАЎ**. — Аднак, калі трапіў у гэты музей, адчуў яго гістарычнасць, пачуцці нахлынулі яшчэ больш...

— Падобнае званне атрымліваюць далёка не кожны міліцыянер. Гонар за сябе адчуваеце?

— Для таго, каб навучыцца абараняць і паважаць іншых, трэба найперш навучыцца паважаць сябе. Безумоўна, гонар, самапавага прысутнічае, але падобнае пачуццё мяжуе з яшчэ большай адказнасцю за свой калектыў, за сябе, за сям'ю, за сваю краіну.

— Для большасці нашых супрацоўнікаў званне палкоўніка міліцыі — фінішнае, — кажа **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ**. — Яно гістарычна самае важнае. І кожны, хто атрымлівае яго, адчувае большую адказнасць, на маю думку, становіцца нават больш зграбным. Пры гэтым само яно мудрасці і розуму не дабаўляе, аднак да многага абавязвае. І ў тым ліку да таго, каб навука кіравання стала асновай будучай службы, каб чалавек і яго акружэнне разумелі, што ён палкоўнік міліцыі.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■ Фестывалім!

УРОКІ Ў «МЯККАЙ ШКОЛЕ»

100 чалавек, у тым ліку 48 дзяцей, узялі ўдзел у першым у Беларусі фестывалі сем'яў усынавіцеляў, які прайшоў у Валожынскім раёне.

У сем'ях усынавіцеляў умовы пражывання і выхавання дзяцей кантралююцца на працягу трох гадоў. А далей бацькі могуць звяртацца па дапамогу, калі неабходна. З прычыны таго, што часам у такіх сем'ях узнікаюць пэўныя цяжкасці з выхаваннем дзяцей, Нацыянальны цэнтр усынаўлення сумесна з упраўленнем адукацыі Мінаблвыканкама і вырашылі правесці фестываль, дзе ўсе праблемныя пытанні можна разгледзець у неформальных умовах. У правядзенні ўрокаў у «Сямейнай мяккай школе», семінараў і практыкумаў, арт-тэрапеўтычных заняткаў, майстар-класаў удзельнічалі вопытныя псіхолагі.

28 сем'яў, якія ўжо ўсынавілі дзяцей, і 2 сям'і — кандыдаты ва ўсынавіцелі пражывалі ў палатках альбо ў нумарах на базе аздараўленчага цэнтра «Галактыка». Фестываль, на думку ўдзельнікаў, дапамог ім развітацца з міфамі, якія існуюць на гэтую тэму, упэўніў у меркаванні, што можна і трэба казаць пра ўсынаўленне адкрыта.

— Гэтае мерапрыемства яшчэ раз паказала, што ўсе цяжкасці, якія могуць узнікаць у сем'ях усынавіцеляў, пераадольныя, — падкрэсліла **начальнік аддзела сацыяльнай і выхаваўчай работы ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Вольга ГЛІНСКАЯ**. — Весела праведзены час на прыродзе дазволіў бацькам і іх дзецям яшчэ больш згуртавацца, знайсці шляхі вырашэння праблем, пазнаёміцца з аднадумцамі. Сем'і ўсынавіцеляў маюць патрэбу ў такіх зносінах. Таму я думаю, што падобныя фестывалі будуць праводзіцца штогод.

Надзея ПАЎЛАВА

■ Нататкі таткі

СТРАХ НЕ АПРАЎДАЦЬ ЧАКАННІ

Раніца. На гадзінніку — 4.05. Я сяджу за кап'ютарам і пішу гэты тэкст. У суседнім пакоі салодка спяць жонка і дачка. Так рана я прачнуўся не ад бяссонніцы. Проста даў сабе зарок рабіць усё магчымае, каб не «паліць» на працу час, які магу правесці з малой. Ёй толькі год і чатыры, але я перакананы: кожны дзень яна чакае мяне, і я не хачу руйнаваць яе надзеі.

Увогуле, я адношу сябе да катэгорыі тых людзей, якія намагаюцца працу пакідаць у офісе. Я не прыхільнік «хатніх заданняў». Яшчэ больш гэтая тэорыя ўмацавалася пасля нараджэння Васілісы. Спачатку я проста імкнуўся больш дапамагаць жонцы. Потым стаў адчуваць, што дачка патрабуе ўвагі таты. Штодзень яна звычайна сустракае мяне на парозе кватэры. Не паспяваеш кінуць кудынебудзь рэчы, яна ўжо хапае за руку і цягне гуляць. Найбольш ёй падабаецца чытаць. Падвядзе да паліцы і пальчыкам паказвае, якія кніжкі ёй цікавыя. Выбера дзве-тры і хуценька імчыць на канапу. Там узбіраецца табе на рукі і пачынае «чытанне». Безумоўна, вытрымкі малой яшчэ надоўга не хапае, але хвілін 20-30 яна можа з цікавасцю гартаць старонкі, слухаць казкі, на сваёй мове называць намаляваных персанажаў. Пасля гэтага — пірамідкі, мяч, хованкі, «тата-ігого» і проста гарэзлівая бегатня па пакоях.

Не так даўно мне давялося ўзяць з сабой дадому працу. Няпланавы занятак аўтаматычна парушыў усю традыцыйную праграму. Я прасядзеў вечар на канапе, але на руках быў ноўтбук, а не малая, замест дзіцячых кніжак — стос розных папер. Дачка па звычцы хапала мяне за руку і паказвала ў бок кніжнай паліцы, масцілася побач, спрабавала «чытаць» мае раздрукоўкі, прыносіла цацкі — рабіла ўсё магчымае, каб прыцягнуць увагу. Але бацька са сваім тэрміновым заданнем быў няўмольны. Расчараваўшыся, Васіліса пайшла бавіць час з мамай і лялькамі.

Напэўна, сітуацыя — стандартная. Бацькам нярэдка даводзіцца абдзяляць увагай дзяцей. Для нас тут усё зразумела: што ж зробіш, калі так склаліся абставіны... Толькі вось у малых зусім іншае светаўспрыманне. Прынамсі мая дачка на наступны дзень сустракала мяне ўжо не так радасна, я быў пазбаўлены прывітальнай буські, ды і на гульні яна адгукалася з меншай ахвотай. Магчыма, проста супадзенне, але мне было ніякавата.

У маёй галаве назаўсёды засеў адзін успамін. Было гэта ў класе 9-м ці 10-м. Я вяртаўся з раённай алімпіяды па гісторыі. Вяртаўся з першым месцам. Радасці дабаўляў той факт, што некалькі дзён таму такі ж вынік прадэманстраваў і па біялогіі. Адчуваў сябе абсалютным пераможцам. На крылах радасці я ляцеў дадому, каб расказаць усім пра сваё шчасце. На аўтобусе даехаў з райцэнтра да суседняй вёскі, адтуль — некалькі кіламетраў пешшу. Першым, каго я сустрэў, быў бацька. Ён калоў дровы. «У мяне зноў першае месца! Уяўляеш?!» — адразу ж выдаў я і змоўк у чаканні яго віншаванняў. «Нарэшце, прыехаў. Вунь колькі дроў яшчэ не пасечаных!» — не адрываючыся ад справы, буркнуў бацька. Я разгубіўся. Чакаў хвалы, а атрымаў дакор. У адно імгненне радасць кудысьці знікла, а дасягненне страціла сваю значнасць. І калі ўжо ў доме маці запыталася, як справы, пра перамогу расказваў стрымана, неахвотна.

Мой бацька — чалавек старой закалкі. Ён скупы на эмоцыі. Безумоўна, па жыцці тата не аднойчы падтрымліваў мяне, даваў слушныя парады, некалькі разоў нават здзіўляў сваёй сентыментальнасцю. Але той выпадак назаўсёды адклаўся ў маёй падсвядомасці. З тых часоў пра свае поспехі я заўсёды расказваю асцярожна і стрымана, каб зноў не натыкнуцца на абыякавасць. Калі ж я сам стаў бацькам да гэтага страху далучыўся яшчэ адзін. Страх не апраўдаць чаканні свайго дзіцяці, боязь павесці сябе так, што малая адчуе абыякавасць з майго боку. Гэта не дае мне спакою. Магчыма, так і лепей. Цяпер я імкнуся быць больш уважлівым і знаходзіць больш вольнага часу для дачкі.

Праз некалькі дзён пасля прыведзенага вышэй выпадку Васіліса змяніла гнеў на літасць. Мяне зноў сустракаюць буськай і адразу цягнуць гуляць. Я ж, у сваю чаргу, больш ніколі не бяру працу на дом, а калі і даводзіцца, то раблю яе, калі Васіліса ўжо спіць. Мы выдатна разам бавім час. Кожны дзень я бачу, як мяняецца малая, як яна сталее і пазнае свет, а гэта куды прыемней, чым любыя дасягненні на працы ці дадатковыя гадзіны сну.

Аляксандр АЛЕСІК.

■ Пераадоленне

«Я НЕ ХАЦЕЎ БЫЦЬ ПРОСТА ГАЛАВОЙ, ЯКАЯ ЎМЕЕ ГАВАРЫЦЬ»

Незвычайная гісторыя першага кахання... з працягам

Дзесяць гадоў таму Саша атрымаў вельмі цяжкую траўму і страціў усё: здароўе, сям'ю, працу... Але жаданне жыць паўнавартасна не дазволіла яму адчайвацца. Мужчына старанна працаваў над сабой, ды і пачуццё гумару не дазволіла здацца цяжкім абставінам... А на пазамінулым тыдні ён ажаніўся... са сваёй былой аднакласніцай. За шмат гадоў іх пачуцці перажылі нямала выпрабаванняў. Але, нягледзячы ні на што, маладыя людзі ўсё ж здолелі зберагчы сваё пяшчотнае каханне.

Дзецям ідэя вяселля падалася цудоўнай.

ШКОЛЬНЫЯ СПАТКАННІ

Вія: — Саша прыйшоў да нас у дзявятым класе. Такі вясёлы, лёгкі, вельмі прыгожы і моцны. Зразумела, я адразу закахалася. Будучы муж часта праважаў мяне пасля ўрокаў да дому і нават некалькі разоў запрашаў на спатканні... Мы сустракаліся год. А потым ён паступіў у вучылішча. Я так пакутавала. Ведаеце, падлеткавае каханне заўсёды вельмі моцнае. Неўзабаве я з бацькамі пераехала жыць у іншы раён — і кантакты з Сашам увогуле згубіліся. Але часта ўспамінала яго з пяшчотай... Скончыла ўніверсітэт, выйшла замуж. У мяне нарадзіўся сын Уладзіслаў. Але жыць з першым мужам я не змагла. У 2004 годзе мы развяліся. Часта ўспамінала сваё першае каханне. Праз аднакласнікаў даведалася, што Саша ажаніўся і стаў татам. Больш яго не шукала...

ЖЫЦЦЁ БЕЗ ВІІ

Саша: — Я ажаніўся, і ў мяне таксама нарадзіўся сын — Станіслаў. З жонкай у мяне адносіны не складваліся. Аднойчы пасварыліся так, што я сышоў... На самай справе паехаў адпачываць з сябрамі і, вядома, купацца. Я быў у сабе ўпэўнены, бо прафесійна займаўся і хакеем, і плаваннем. Вырашыў скокнуць з вышкі... У той момант я нічога не адчуў, але выплыць не мог, бо маё цела было нерухомым. Так і ляжаў пад вадой некалькі хвілін. Спачатку проста стрымліваў дыханне, потым пачаў па трошку піць. А далей цемра. Калі апрытомнеў, лекар у мяне спытаўся, каму патэлефанаваць. Так я даведаўся, што, магчыма, не дажыву да раніцы... Але дажыў! У той момант я сур'ёзна не ўспрымаў таго, што са мной здарылася. Думаў: «Паваляюся» ў бальніцах з паўгода, і ўсё — на працу». Неяк папрасіў брата прывезці мне гантэлі, каб займацца. Той мне не адмовіў, але прывёз... губкі для мыцця посуду. Я нават пакрыўдзіўся: я — здаровы мужык, спартсмен, а ён мне нейкія мачалкі! Брат тады мне сказаў: «Можа, я табе навіну скажу, але паглядзі, ты ж увогуле не рухаешся!» А мне здавалася, што магу рухацца... Але я вырашыў для сябе: пачну хадзіць, чаго б мне гэта ні каштавала. Дабіўся таго, каб мяне накіравалі ў рэабілітацыйны цэнтр у Аксакаўшчыне. Там адразу не хацелі прымаць. Маўляў, гаварыць і есці ўжо магу, а чаго яшчэ чакаць з пераломам шыйнага пазванка і моцным пашкоджаннем спіннога мозгу? Але я не хацеў быць проста галавой, якая ўмее гаварыць. Узялі. Займаліся са мной вельмі добрасумленна: з раніцы да самага вечара.

Шмат розных людзей пабачыў. Уразіў мужчына з траўмай, не такой цяжкой, як у мяне. За ім глядзела жонка, ва ўсім дапамагала, было відаць, што кахае... А ён убіў сабе ў галаву, што не будзе клопатам для сям'і. Два разы дацягваўся да акна, каб выкінуцца. І яму ўдавалася. Але шанцавала: падаў, але заўсёды амаль без пашкоджанняў. У выніку займаўся, як ашалелы, каб дайсці да турніка і... павесіцца.

Але такі канец не для мяне. Люблю жыццё. Пасля рэабілітацыі я ўмеў рухаць плячыма і трошкі рукамі. А галоўнае ведаў, як патрэбна займацца, каб мой арганізм працаваў. З жонкай мірыцца не сталі. Так зоркі склаліся, што вярнуўся дадому да маці. Дэпрэсіі ў мяне ніколі не было. А чаго ёй быць? Сябры мяне не кінулі, маці і брат — побач, сын расце... Былі і хвіліны адчаю, але яны зрабілі мяне толькі мацнейшым.

ПОШУК

Саша: — Я шукаў Вію, але доўга не знаходзіў. Калі з'явіліся сацыяльныя сеткі, зарэгістраваўся ў «Аднакласніках». Але там яе таксама не было. Праўда, праз некаторы час яна зарэгістравалася. Мне так хацелася ёй напісаць, але ніяк не мог адважыцца. Самі разумееце, ужо не прынц на белым кані. Потым усё ж не вытрымаў і напісаў. Адчуў, што Вія абрадавалася. Яна даслала мне свой нумар тэлефона.

Вія: — Я так спадзявалася, што ён мне патэлефануе, так чакала...

Саша: — А я вельмі саромеўся. Не мог адважыцца дні са тры. А потым не вытрымаў, пазваніў і адразу запрасіў на гарбату. Каб Вія не адчувала сябе няёмка, прапанаваў прыйсці з яшчэ адной аднакласніцай.

Вія: — Мне так хацелася яго ўбачыць. Наша сяброўка ў той дзень не змагла, і я паехала адна. Мы ніяк не маглі нагаварыцца. Усё ўспомнілася: першае каханне, пацалунак, разлука і мае пакуты... І вось ён побач такі ж вясёлы і такі ж прыгожы! Больш мы ніколі не расставаліся. Я да яго прыязджала з сынам, і мы часта бавілі разам час. Калі-нікалі я заставалася ў яго і даглядала. Усім сэрцам адчувала, што павінна быць побач з Сашам. У нас ужо нарадзіўся сын Павел, а я ўсё разрывалася паміж домам, працай і сваім каханнем. Калі Павел трошкі падрос, на сямейным савеце мы прынялі рашэнне пераехаць да таты.

«У той момант я нічога не адчуў, але выплыць не мог, бо маё цела было нерухомым. Так і ляжаў пад вадой некалькі хвілін».

Я разумела, што ў гэтым выпадку згублю працу, бо не змагу адначасова даглядаць і малых дзяцей, і свайго мужа. Там, дома, мяне заўсёды падтрымлівала маці, а тут такой дапамогі не будзе. Я звольнілася з працы і ў адзін дзень пераехала да каханага. Нават сёння памятаю, як прыехала, яшчэ не разабрала рэчы і прысела, а на мяне ўжо глядзяць чатыры пары галодных вачэй: мужа і траіх сыноў — Станіслава, які кожнае лета праводзіць у таты, Уладзіслава і маленькага Паўла. Стала так страшна, але я ўзяла сябе ў рукі і пайшла гатаваць ежу. Усе выпрабаванні былі толькі наперадзе.

ВЫПРАБАВАННІ І ДЗІМА-АНЁЛ

Вія: — Я турбавалася, як мы будзем жыць без маёй працы. Калі шчыра, страшна было за будучыню. Але... У нашым жыцці з'явіўся цудоўны чалавек. Зразумела, ён быў не адзіны, хто працягнуў Сашу руку дапамогі, але сёння хочацца расказаць менавіта пра яго.

Саша: — У пагоні за самастойнасцю, я размясціў на адным з сайтаў просьбу аб дапамозе. Адгукнуўся тады толькі адзін чалавек — Дзіма з Масквы. Самы незвычайны «звычайны бізнесмен». Ён мне патэлефанаваў і спытаў, што мне патрэбна. Я папрасіў каляску. Для людзей з траўмай шыі звычайныя не падыходзяць. І ён знайшоў мне патрэбную. А потым спецыяльны ложак для людзей з траўмай пазваночніка, супрацьпролежневую падушку, машыну, спецыяльны кран у аўто, каб мяне было зручней туды садзіць...

Вія: — Калі Дзіма даведаўся пра мяне, ён шчыра ўзрадаваўся за Сашу. Кожны месяц стаў высылаць грошы... Так што лекамі і памперсамі мы былі забяспечаны. Для мяне набыў прафесійную швейную апаратуру, маўляў, калі сам ужо не здолее нам дапамагаць, каб мы больш-менш маглі забяспечыць сваё існаванне, не выходзячы з дому.

Саша: — Пару гадоў таму, ён настаяў, каб мы паехалі адпачыць на поўдзень. Набыў нам пуцёўкі ў спецыяльны санаторый, дзе я мог праходзіць рэабілітацыю.

Вія: — На фоне спёкі ў Сашы распухла нага (пачалася флегмона). Дзякуючы гэтай паездцы выявілася, што ў мужа ўжо даўно ўнутры моцнае запаленне. Яму тэрмінова патрэбна аперацыя, інакш ён загіне...

Саша: — Нас накіравалі назад у Мінск. Памятаю, ляцім у самалёце. У мяне тэмпература пад 40, адчуваю, што зараз страчу прытомнасць, і загадзя пачынаю супакойваць Вію. Ведаеце, яна такая эмацыйная, што, калі б са мной што-небудзь здарылася, самалёт прыйшлося б садзіць *(смяецца)*...Аперацыя прайшла паспяхова. Ізноў спатрэбілася доўгая рэабілітацыя. На гэты раз мне было значна лягчэй. Са мной побач былі Вія і мае дзеці. Пасля ўсіх выпрабаванняў я зразумеў, што прыйшоў час аформіць нашы адносіны законна.

«Мне так хацелася ёй напісаць, але ніяк не мог адважыцца. Самі разумееце, ужо не прынц на белым кані».

Вія: — Я і раней лічыла нас сям'ёй, а штамп — гэта так, для галачкі. Аднак усё роўна хвалявалася. Ды і дзецям гэтая ідэя падалася цудоўнай...

Саша: — Шкада, Дзіма не дажыў да гэтага часу... Ён памёр ціха — спынілася сэрца. Вельмі хацеў, каб наша сям'я адпачыла пасля рэабілітацыі і ўсіх хваляванняў у Італіі. Але мы адмовіліся ад яго прапановы. Таксама ён перажываў, што я з Віяй амаль нікуды не хаджу: ні ў кавярні, ні ў тэатры... Так, у нашых умовах актыўнае жыццё складана весці, але мы ўсё ж патроху выходзім з «ценю». Ездзім на дачу, сустракаемся з сябрамі, гуляем па вуліцы... Дзякуючы дапамозе маіх сяброў і родных, праз дзесяць гадоў траўмы я магу гаварыць, трымаць галаву і кубак. А зараз амаль навучыўся сядзець без апоры і не губляю пры гэтым прытомнасць. І, зразумела, самае галоўнае: мне пашанцавала ў маім жыцці ў тым, што я адчуў, як гэта — кахаць і быць каханым.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
talivinskaya@zviazda.by

Фота з сямейнага архіва герояў

■ Кропка на... сэрцы

МОЦНАЯ ДУХАМ

Сям'я Голуб чакала першынца. Дзевятнаццацігадовая Вольга ўся была ў прадчуванні шчасця мацярынства. І вось прыйшоў ён, той дзень, калі дзіця павінна было з'явіцца на свет. Але падчас родаў раптам нешта пайшло не так. Нованароджаны хлопчык атрымаў траўму і цэлы тыдзень знаходзіўся паміж жыццём і смерцю. У Юр'еў дзень ён упершыню дыхнуў самастойна, без апаратаў, таму і далі бацькі сыну імя Юрый. Праўда, тады маладая мама зусім не ўяўляла, якімі могуць быць вынікі асфіксіі, што здарылася пры родах. Але, нават калі б і ўяўляла, як упэўнена Вольга, усё роўна ніколі б не адмовілася ад сына, якой бы цяжкой ні малявалі ёй будучыню.

Першыя месяцы ў развіцці маленькага Юры маладая мама нічога незвычайнага не заўважала. Ды і ўрачы маўчалі. Першай забіла трывогу бабуля — маці Вольгі. У бальніцы, агледзеўшы хлопчыка, сказалі, што няма ніякіх асаблівых падстаў для хвалявання. Але ішоў час, і праблемы станавіліся ўсё больш відавочнымі. А потым, як жорсткі прыгавор, прагучалі словы ўрача абласной дзіцячай кансультацыі: «У вашага сына цяжкая хвароба, верагодна, ён увогуле не будзе хадзіць». Надзея, як кажуць, памірае апошняй, таму бацькі не здаваліся. Шэсць гадоў яны ездзілі з сынам у медыцынскі цэнтр «Тонус». Але асаблівых вынікаў гэта не дало. Былі яшчэ спадзяванні на аперацыю, але і іх развеялі ўрачы, растлумачыўшы, што з такім дыягназам як дзіцячы цэрэбральны параліч самай складанай 4-й ступені, рабіць аперацыю бессэнсоўна. Бацькам заставалася сабраць усе сілы ў кулак і цярпліва несці свой крыж.

Як заўважала пісьменніца Эліза Ажэшка, ні адзін чалавек сілы сваёй не ведае, пакуль яна не спатрэбіцца. Вось і Вольга не думала, што, акружыўшы цяплом і клопатам свайго сына Юру, які не мог ні рухацца, ні размаўляць і якому кожную хвіліну патрэбна была ўвага, адважыцца стаць шматдзетнай мамай — нарадзіць яшчэ дваіх сыноў. А потым, калі яны падрастуць, пойдзе працаваць туды, дзе вельмі карысным будзе яе вопыт — памочнікам выхавальніка ў спецыяльную групу для дзетак з цяжкімі адхіленнямі ў псіхафізічным развіцці.

Асмеліцца на такі крок як нараджэнне другога дзіцяці Вользе і яе мужу Віктару было няпроста. Хоць разумелі, што праблемы са здароўем Юры былі звязаны не з генетыкай, а з ускладненнямі пры родах, думкі не давалі спакою. З палёгкай уздыхнулі толькі тады, калі пачулі, што сын нарадзіўся здаровым. А яшчэ праз тры гады Вольга стала тройчы мамай. Вялікая сям'я — вялікія клопаты. Але Вольгу гэта не пужала. Яна радавалася, што разам з меншымі дзецьмі, Артурам і Сашам, і Юра адчуваў сябе інакш. У яго з'явілася цікавасць да цацак, ён навучыўся глядзець мультфільмы. Адным словам, ажываў.

Звыклы рытм жыцця сям'і змяніўся, калі Вользе прапанавалі работу памочніка выхавальніка ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання, дзе тры гады таму адкрылася спецыяльная група для дзетак з цяжкімі адхіленнямі ў развіцці. Для новай групы яна была знаходкай, бо са свайго жыццёвага досведу добра ведала, як знайсці падыход да «асаблівага» дзіцяці, магла падказаць, дапамагчы, растлумачыць.

— На час адкрыцця групы Вольга Пятроўна была ў нас, можна сказаць, ключавой фігурай. Ні ў каго, акрамя яе, не было навыкаў работы з такімі дзецьмі. А таму і выхавальнікі, і ўвогуле ўсе мы прыслухоўваліся да яе парад, — успамінае дырэктар цэнтра Людміла Лукавец.

Але не толькі па першым часе ў групе не маглі абысціся без Вольгі. Без яе тут і сёння як без рук. Работа з «асаблівымі» дзецьмі няпростая. Памочнік выхавальніка і выхавальнік у адной звязцы і ў час заняткаў, і за абедам, калі трэба накарміць дзяцей, і на прагулцы. І так з ранку да вечара. А пасля работы Вольга спяшаецца дамоў, дзе яе чакае ў тым ліку Юра, якога ніхто не разумее так, як мама. Хоць у канцы дня маральныя і фізічныя сілы, прызнаецца Вольга, ужо на зыходзе, зранку і сям'я, і калегі зноў бачаць на яе вуснах прывычную, крыху загадкавую і заўжды шчырую ўсмешку. І яе пазітыў перадаецца іншым.

Святлана МАКСІМУК.
Фота аўтара

■

■ Вазьму твой боль...

ШЧАСЦЕ Ў НЯШЧАСНЫХ УМОВАХ

Мы шмат патрабуем ад жыцця. Мы заўсёды чымсьці незадаволены, нам увесь час чагосьці не хапае. І толькі заўважаючы гора суседа, гледзячы на пакуты іншых, пераацэньваем сваё становішча: а ў мяне і не так блага, як падавалася.

У Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі шмат гадоў я штодня назіраю чужое гора. І гэтае назіранне ніколі не давала мне думкі, што ў параўнанні з іх праблемамі мае праблемы — нішто. Наадварот, у іх я вучуся простым жыццёвым радасцям. Тут да месца думка: маё шчасце істотна меншае ў параўнанні з іх шчасцем. Нелагічна — разумею. Я патлумачу.

Ты ў чарговы раз прыходзіш у палату праведаць сябра. Ужо прызвычайваешся да вашых размоў, жартаў, гульняў, нават забываешся, што гэта за месца і што ён хварэе на рак. Ты не рыхтуешся да нечага асаблівага. І раптам знаходзіш яго ў горшым стане. Ён не гатовы размаўляць, не рэагуе на жарты і не можа падтрымаць улюбёныя гульні. Яму дрэнна. І ты губляешся.

Проста ўзяць і сысці — няёмка, заставацца — яшчэ горш. І чулая маці, якая, у адрозненне ад цябе, прышлай сяброўкі, ні на хвіліну не забывалася, дзе яна знаходзіцца і які дыягназ у яе чада, прыходзіць табе на дапамогу. Яна ветліва ўсміхаецца, падтрымлівае размову, частуе цябе гарбатай, цікавіцца навінамі і распавядае пра будзённыя справы. Быццам бы гэта не яе дзіця зараз пакутліва зморшчылася на ложку. Яна заўважае тваю разгубленасць і адчувае твой страх. Ціха і спакойна выводзіць з няпрошаных думак. Яе ўсмешка супакойвае.

І толькі з часам ты зразумееш і ацэніш яе ўменне жыць звычайным жыццём у незвычайных умовах.

Я памятаю, якія вясёлыя пікнікі мы ладзілі ў кампаніі цяжка хворых дзяцей, адыходзячы за паўсотню метраў ад бальніцы. Я нідзе не ела больш смачных шашлыкоў, ні з кім не спявала больш душэўных песень і нідзе так не гарэзіла, як на тых пікніках.

Мы ладзілі касцюміраваныя шоу, прыдумлялі новыя танцавальныя рухі, сачынялі жартаўлівыя паэмы. Гэта было так натуральна весела, што ў той момант кожны разумеў: я шчаслівы, нягледзячы ні на што.

Я любіла ездзіць у дзіцячы анкацэнтр у часы сваіх душэўных пакут. Бо там яны знікалі і забываліся. Дзеці радавалі забавамі ў гульнявым пакоі. Мы не заўважалі кропельніц на штатывах, медыцынскіх масак ад лішніх інфекцый, перапынкаў на прыёмы лекаў. У працэсе гульні ў пакой заходзіла медсястра, падключала камусьці апарат ці дабаўляла новы шпрыц да кропельніцы. Мы не зважалі на гэтыя моманты, і яны не бянтэжылі наша моцнае пачуццё агульнай радасці.

Калі дзеці адпраўляліся на адпачынак, я далучалася да душэўных размоў матуль на агульнай кухні.

— Ну, як твае справы, Тань? Памірылася са сваім хлопцам? — з непадробным інтарэсам пыталася цёця Ліля.

— А як начальнік на рабоце, усё такі ж патрабавальны? — па-мацярынску спачувальна цікавілася Лена.

— Мы ведалі, што ты сёння прыедзеш, дык пірагоў напяклі, — далучалася да кампаніі Наташына маці.

І на гэтай кухні сапраўды знікалі ўсе мае праблемы. Не таму што я іх параўноўвала з горам матуль і іх хворых дзяцей. Не. А таму што яны ўмелі радавацца таму, што мелі. І вучылі гэтаму мяне.

Часам я забываюся на тыя ўрокі і страчваю навыкі быць шчаслівай. Зноў шукаю тое, чаго не хапае, патрабую нешта, чаго не маю, хачу чагосьці, сама не ведаю чаго... І тады жыццё нагадвае, дае падказку.

Больш за дзесяць гадоў таму я з'ехала з роднага мястэчка і перабралася ў сталіцу. Цяпер не часта бываю на радзіме. А як прыязджаю наведаць маці, маю шмат прэтэнзій да правінцыйнага быту. Мяне абурае асартымент у крамах, злуе дрэнная мабільная сувязь, засмучае адсутнасць культурнай праграмы і недахоп цывілізацыі.

І вось я трапляю на раённае мерапрыемства, вельмі годна падрыхтаванае. Канцэрт праходзіць на адкрытай пляцоўцы ў цэнтральным парку. Усе тры гадзіны лье дождж. Публіка рознаўзроставая, шматлюдна. Адзін за адным на сцэну выходзяць мясцовыя самадзейныя спевакі, рок-гурт з суседняга раёна і нават артысты з абласной філармоніі. На дварэ змяркаецца, дождж толькі ўзмацняецца. Гледачы не разыходзяцца.

Раптам з натоўпу вылучаецца хударлявы мужчына — у ім я пазнала аднакласніка — і накіроўваецца да сцэны. Ён выхоплівае мікрафон у сексапільнай спявачкі і бойка выкрыквае: «Землякі, выходзьце танчыць на пляцоўку!» І яны ідуць. З парасонамі і без, старыя і малыя, у спартыўных касцюмах і святочных уборах, з адточанамі рухамі і нязграбнымі, падзабытымі танцамі, «пад мухай» і абсалютна цвярозыя. Я зайздрошчу іх адкрытасці, лёгкасці, свабодзе і незакамплексаванасці.

Гляджу на сталую жанчыну, якая адна вырасціла траіх дзяцей, усё жыццё працуючы прыбіральшчыцай. Яна кружыць у вальсе са сваім парасонам. І так шчыра аддаецца танцу! Яна проста робіць тое, ад чаго можа атрымаць задавальненне роўна ў гэтую хвіліну. Яна шчаслівая тым, што мае. А мае яна самае галоўнае — унутранае шчасце, якое не залежыць ад абставін і заўсёды разам з ёй.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»

■

■ Лёсы людскія

ПАКАРАННЕ

Напярадзе, крокаў за дзесяць, няспешна тупала бабуля. Яна цягнула старую сумку, прывязаную да каляскі на маленькіх колах. Сумка, было відаць, пустая. Постаць жанчыны крыху згорбленая, крокі — стомленага ўзростам чалавека. Мы рухаліся ў адным кірунку, і мне не хацелася яе абганяць. Штосьці было ў той постаці такое, што прыцягвала позірк і падказвала, што бабуля не з тутэйшых мясцін. Адлегласць між намі неўзабаве скарацілася, і, калі мы параўняліся, яна адазвалася першай:

— Дзетачка, можа, ведаеце кароткую дарогу да вакзала? — і тут жа неяк безабаронна растлумачыла. — Ногі ўжо не тыя, не хочацца іх ператамляць.

Я павярнулася адказаць, як прайсці дварамі напрасткі, і ўбачыла інтэлігентны дагледжаны тварык з прыкметамі небывалай прыгажосці ў юнацтве, але выраз яго ў гэтую хвіліну быў нейкі надта бездапаможны. Растлумачыўшы, нечакана для сябе прапанавала стаць яе спадарожніцай на некаторую частку шляху. Бабуля ўважліва паглядзела мне ў вочы і ўдзячна ўсміхнулася.

«Піў ён, а п'яны тварыў жудасныя рэчы: біў мяне, выганяў на вуліцу. Участковы, дзякуй яму, і дапамог яго пасадзіць».

— Не хвалюйцеся, сумку мне не трэба дапамагаць цягнуць, яна пустая, — і стала расказваць. — Тут у мяне сын у калоніі сядзіць. Прыязджала да яго, прывозіла прадукты.

Жанчына, здаецца, была рада майму з'яўленню. І, як гэта бывае ў дарозе лёгка адкрыцца спадарожніку, з якім больш ніколі не сустрэнешся, выпаліла:

— Гэта я яго пасадзіла...

Сказала тое, што яе мучыла, непакоіла і што яна мала каму б даверыла са свайго асяроддзя. Мы маўчалі. Мне здалося, бабуля чакае ад мяне асуджэння. Яе словы разанулі па сэрцы, і сапраўды хацелася ёй сказаць крыўднае: «А яшчэ маці, сына свайго не пашкадавала». У душы бурліла абурэнне: жыве для сябе, бач, якая выпешчаная, але вымавіць нічога не змагла. Жанчына, бы сапёр, які размініраваў міну, вытрымаўшы паўзу, прадоўжыла.

— Піў ён, а п'яны тварыў жудасныя рэчы: біў мяне, выганяў на вуліцу. Участковы, дзякуй яму, і дапамог яго пасадзіць.

Стала шкада бабульку і яе сына. Колькі разоў казала сабе: не асуджай нікога. І кожны раз — на адны і тыя ж граблі. Вось не прайшло і некалькі хвілін, а ад майго гневу не засталося нічога, сітуацыя перавярнулася на 180 градусаў. Сын-алкаголік, які гэта боль для маці!

— Ён у мяне харошы. Займаўся ў мастацкай студыі, маляваў нядрэнныя карціны, надзеі падаваў, казалі выкладчыкі, але неяк няўдала ажаніўся. Яна патрабавала грошай, а ў яго зарплата маленькая, а падзарабляць удала не выходзіла. З перажывання стаў заглядваць у кілішак. Жонка яго тады выгнала, ён з гора яшчэ больш запіў. А п'яны, ён не цяміць, што робіць. Змучылася я. А нядаўна ён з маладухай звязаўся. У целе такая, пышная, але непаўналетняя аказалася. Вось на гэтым мы яго і «спалілі». Яны жылі па згодзе, ён нікога не гвалціў. Але мне ўчастковы падказаў, што за факт, што яна непаўналетняя, можна добра ўчапіцца. І ў чарговы раз, калі ён дэбашырыў, параіў напісаць заяву. Участковаму п'янкі майго сына таксама надакучылі...

Я маўчала, і, здавалася, бабуля была мне за гэта ўдзячна.

— Як ён не даваўся наручнікі адзець! Біўся, ён жа здаровы ў мяне, высокі, сіла не мераная. Але неяк звязалі, я толькі прасіла: «Не біце яго!» Паляжаў ён некалькі гадзін, працверазеў крыху, і яго павезлі...

Зноў мы ішлі моўчкі, пакуль бабуля справілася з няпрошанымі слязамі.

— Тут умовы харошыя. Чысценька. Сабрала яму, што было. Каўбаскі крыху, печыва, смятаны на рынку купіла, ён такую любіць.

Каб хоць неяк стаць суразмоўніцай, заківала ў знак згоды галавою. А бабуля раптам заспяшалася, каб паспець сказаць усё, што набалела.

— Пасадзіла яго, акаянная. І столькі гора на мяне навалілася. Памерла сястра мая адзіная. Прыехала ў Мінск яе дачка, уяўляеце, праз паўгода і яна памерла. Рак. Давялося і яе мне хаваць, а потым кватэру на сябе афармляць. Цяпер я багатая старая, — зусім не радасна заўважыла мая спадарожніца. — У сына вось пыталася, што рабіць мне з гэтай кватэрай. Плаціць за абедзве з пенсіі накладна. Кватарантам асцерагаюся здаць, убачаць, што бабка адзінокая, яшчэ заб'юць ці атруцяць. Жыллё ў Мінску вунь якое дарагое! І прадаць баюся, раптам сына выпусцяць датэрмінова. Ён жа мяне зноў выганяць будзе, успомніць усё мне. Тады б я пайшла жыць у кватэру сястры. А сын раіць прадаць, кажа: «Мама, прадай і радуйся жыццю».

Мы спыніліся, бо нашы шляхі разыходзіліся. Я паказала напрамак да вакзала, але на развітанне мне хацелася супакоіць і абнадзеіць бабулю:

— Сын ваш не будзе помсціць. І піць не будзе больш, ён пакаяўся. А вы для яго самы дарагі чалавек. Вы — маці.

Жанчына зноў працяжна, бы наскрозь, паглядзела ў мае вочы. Падалося, што яна вельмі хоча мне паверыць.

— Я малюся. Хай толькі даруе... Худы зусім, адны вочы...

Бабуля хацела яшчэ штосьці сказаць, памкнулася да мяне бліжэй, але раптам перадумала, махнула бяссільна рукой і пайшла. І постаць яе са спіны здавалася зломленай.

Валянціна БОБРЫК,

г. Івацэвічы

■

Каля млына

Самы значны вынік усялякага добрага падарожжа, самы, я сказала б, устойлівы маркер гэтай «добрасці», якую так і карціць засіноніміць з авантурнасцю (у процівагу стандартнасці, упарадкаванасці, прадказальнасці і зашоранасці пад дэвізам «Мір — Нясвіж — Белавежская пушча») — гэта свежыя думкі, якія ўзнікаюць на месцах замшэлых ідэй кшталту калекцыянавання магнітаў і выкладання фотаздымкаў у сацсетках. І ніякай няма ў тым бяды, што прымяненне гэтым думкам знаходзіцца не адразу, што доўгі час яны — проста думкі.

Мне часам здаецца, што наш Арчы, калі адмаўляецца паказваць дарогу, дарэмна ганьбіць сувязь са спадарожнікамі — яна тут абсалютна ні пры чым. Проста ён, гарэза, з гаспадарамі на адной хвалі, я вам, маўляў, прапаную новы спосаб пошуку аб'екта. Сапраўды, спосаб варты ўвагі: завітваеш у прыдарожную крамку, уражваешся таварам, якога ў сталіцы да яе сораму не знайсці, і пакуль гаспадынька-крамніца «адпускае» яго, пытаешся, як праехаць туды, куды трэба. І чуеш шэдэўральнае апісанне фінальнай часткі свайго выпакутаванага ўжо маршруту: «Едзеце ўперад, дакуль дарога вядзе, а тады паварочваеце, во як я рукой паказваю». Не ўправа, не ўлева, а «як я рукой паказваю». Не вер чужому слову, а вер свайму воку, як той казаў, бо ўсё роўна, ці за адну нагу вісець ці за дзве целяпацца.

Дасюль была прыказка. Адсюль — казка.

Праязджаючы па Р1 паміж Волчкавічамі і Чаркасамі, заўважыце ўказальнік на Хадакова, павернеце па ім — і без усялякіх чароўных клубкоў адшукаеце не толькі хатку на курыных лапках, але і люстэрка для варажбы, і чароўныя жаронцы, і ступы з мётламі, і цуда-млын. Пункт прызначэння — Рассветная, 70. Месца, вядомае тым, што тут знаходзіцца самы малы млын у нашай краіне. І не сёння створаны, а восем дзясяткаў гадоў таму, у 1936-м. Рэдуктар, праўда, старэйшы — 1889 года паходжання. Млын гэты і цяпер меле зерне так, як раней — дваяка: у муку абдзірную і «тонка». Усё вырашае паварот «баранчыка», які або павялічвае, або памяншае зазор паміж жорнамі. Гэта я так, каб паказаць, што ў нечым разбіраюся.

Хочаце дакрануцца да мінулага? Яго тут можна нават на пах адчуць: дастаткова ўскараскацца па прыступках у сярэдзіну млына. Або завітаць у «Хатнюю кавярню «Буслячок», дзе на паліцы стаіць адстойнік для вяршкоў (рэдкі, керамічны варыянт), у куце — лапата для пасадкі хлябоў у печ, а на сцяне вісяць флягі з часоў Першай сусветнай. Шкляны посуд з яўрэйскай лаўкі, драўляная фармоўка для масла, поршань для гільзы, прыстасаваны пад начыненне каўбас... Ступкі, маслёнкі, пляцёнкі, гарлачыкі. Я павінна ўдакладніць, што апісваю не агрэсядзібу і гэты мой тэкст — не рэклама. Уладальнік калекцыі рарытэтаў, сабраных (дзякуючы, дарэчы, менавіта падарожжам) з усёй краіны, дызайнер Уладзімір Цвірко выцягвае на свет Божы мінуўшчыну, каб яе прымушаць працаваць — апантана і цалкам бясплатна, а не ляжаць-вісець-стаяць-старэць без патрэбы. Лічыльныя косткі тут выконваюць абавязкі балясін, вялізныя каваныя цвікі (набралася 24 штукі) гатовы «адсякаць» хвіліны на драўляным гадзінніку. На куфар ускладзена місія па захаванні навагодніх цацак — і каб вы іх толькі бачылі! Зімою гэтыя зайкі-вавёрачкі-пернічкі вывешваюцца на жывую ёлку. Кінапраектар? І кінапраектар ёсць: вечарамі тут перад экранам могуць збірацца людзі, каб паглядзець старое нямое кіно за 20 капеек. Я ж кажу, гэта поўнае пагружэнне! Вы дакраналіся калі-небудзь да філёнкі з палаца ў Нясвіжы? Там вам гэтага і не дазволяць... А тут — калі ласка. Вы бачылі капітэлі палаца ў Радзівілімонтах? І ўжо не ўбачыце — палац разбураны. Хіба што тут, у вёсцы Хадакова. Каб захаваць кавалак гэтай капітэлі, Уладзімір паўгода вымочваў яго ў «Сенежы».

У рамцы пад шклом — ключ і фрагмент абіўкі мэблі з палаца Пуслоўскіх у Косаве перыяду яго росквіту. «Я спадзяюся, што некаму некалі будзе цікава, як раней перапляталіся ніткі: фактура, структура...»

У бібліятэцы — разгорнуты «Ціхі дон» 1945 года выдання. Хочаце пачытаць? Заставайцеся. А потым гаспадар, калі не будзе надта заняты, магчыма пачастуе вас «сарокамі» з макам. І дасць дакрануцца да вугольчыкаў, якія дагэтуль ляжаць у чыгунным прасе. І раскажа гісторыю пра прас з выявай Льва Талстога.

На стале ў кабінеце — мікраскоп і пенснэ, на паліцы над ім — цэлы шэраг чарнільніц. Хочаце папрацаваць у спрыяльнай атмасферы? Гэта памяшканне, паўтараю, не здаецца. Але калегам-творцам з радасцю прадастаўляецца. «Усё, Валодзя, мяне няма», — кажуць тыя і зачыняюць перад ім, гаспадаром, дзверы. Асабліва тут любяць працаваць фатографы і кінематаграфісты. Антураж спрыяе стварэнню містычных сцэнак.

* * *

...Сярэдзіна XVII стагоддзя. Паселішча Новая вёска, недзе пад Гарадзеяй. Тут у адной з хат жыве варажбітка Уля. Улляна, значыцца. Ратуе дзетак, лекуе дарослых і жывёлу. Вельмі любіць коней. Мілажальная. Глядзіцца зранку ў люстэрка дзівоснай прыгажосці — светлае-светлае, з карункавым «франтонам» і кветкавым аздабленнем. Кажуць, хто гляне на свой адбітак у ім (нават праз трыста гадоў), той атрымае здароўе, прыгажосць і каханне.

Ну, як у тое люстэрка з XVII стагоддзя не зазірнуць?.. Я зазірнула.

Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.

Млын. Самы малы ў Беларусі.

Рамантыкам

Падарожжа на тое і падарожжа, што галоўнае ў ім — дарога. Перамяшчаючыся з аднаго пункта сваёй зацікаўленасці ў другі, якіх толькі цудаў не ўбачыш. То на жніве замест камбайна верталёт суструнецца, то літаральна пасярод кукурузнага поля — кавярня з шыльдай «Адчынена 24 гадзіны». Для каго адчынена? То — «золата пасярод золата» — нафтавыя вышкі з саламянымі катушкамі ў перамешку. То паваротка на Дублін, то ўказальнік на Марс... Аднаго разу прыкмеціла яшчэ здалёк незвычайнае дрэва: быццам не голае, але і не ў лісці. Пад'язджаем бліжэй — лісце ўспорхвае і ўзлятае. Аказалася, дрэўца без лісця (мабыць, памерзла), але аблюбавана вераб'ямі. Казачнае дрэўца. Дагэтуль перад вачыма.

Аналізуючы пачутае, самастойна прыходзіш да думкі, якая ўжо да некага дайшла: зберагчы тое, што займела абрэвіятуру НКС, нематэрыяльную культурную спадчыну (а што прыдарожныя крамкі разам з іх гаспадынькамі да яе адносяцца — факт для мяне асабіста абсалютна неабвержны), — гэта не закансерваваць яе, а ёю карыстацца.

Тое ж, спадарства, і са спадчынай матэрыяльнай. Вось вы думаеце, што музеі хаваюць у сабе рарытэты. Маеце рацыю: яны іх менавіта хаваюць. Таму я раю падарожнічаць туды, дзе не проста музей, а асяродак па-за часам, і не экскурсія, а поўнае пагружэнне.

Ключ і кавалак абіўкі мэблі з палаца Пуслоўскіх.

■ Што бывае

ПРАДКАЗАННІ

Здараецца, шукаеш ледзь не паўдня, марна гойсаючы наўкола, якую-небудзь сядзібу, уражыўшыся або гісторыяй яе ўзвядзення, або лёсамі яе ўладальнікаў. Пры гэтым на інфармацыю пра сучасны стан дастаткова ўвагі не звярнуўшы і таму сённяшні вонкавы выгляд не надта сабе ўяўляючы, пачынаеш у кожнай больш-менш прыдатнай (бо неяк падобнай) будыніне (нашмат больш позняга, кажучы мякка, паходжання) гэтую самую паўлегендарную сядзібу яшчэ здалёк літаральна мроіць. Асабліва калі твой навігатар мае (праз тваю ж неасцярожнасць) фанабэрыстае імя Арчыбальд і ці не з гэтай прычыны дазваляе сабе беспакарана якія заўгодна выбрыкі. Але вось што самае дзіўнае: памылка, якая непазбежна выкрываецца пры набліжэнні да прытворнай паўлегендарнай сядзібы, цябе ніколькі не бянтэжыць. Наадварот — забаўляе: а раптам праз якія сто з нечым гадоў і гэтую, пакуль яшчэ навюткую, сядзібу з пілонамі і бельведэрам будуць упарта шукаць заўзятары змястоўных падарожжаў?

Паслядоўнікам

Калі аматар падарожжаў, выбраўшыся, скажам, у Нясвіж, да Нясвіжу так і не даехаў, то не факт яшчэ, што падарожжа не адбылося. Прыгожая думка! Яе ў маю галаву пасеяў Уладзімір Цвірко, уладальнік апісанага збору пад адкрытым небам ды жырандоляў у выглядзе колаў і, як аказалася, калега-падарожнік і калега па «пяры». Яго «кішэнна-брашурны» праект «150 залатых маршрутаў маёй Беларусі» пачаў друкавацца акурат гэтым летам. Чаму «маёй»? Яму гэтае пытанне ўжо задавалі. Адказаў так: кожны, маўляў, чытае «маёй Беларусі», адносячы яе да сябе асабіста. «Так душэўна...» Гэта прадукт выключна для падарожніка-практыка. Не сувенірны фаліянт з прыгожымі выявамі, прызначаны для кніжнай паліцы ці турыста-іншаземца, каб той як мага больш уразіўся, а чыстай вады ўтыліт: сесці з канкрэтна абранай брашуркай у аўтамабіль на месца штурмана, разгарнуць яе на каленях — і выбраць з прапанаваных кропак якія заўгодна ў любой паслядоўнасці. Не прапусціце!

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

Фестываль «Маскоўскае варэнне» ўжо збіраецца адкрыць свае слоічкі, упрыгожаныя паркалёвымі шляпкамі-спаднічкамі і перавязаныя карункавымі стужкамі. За што Аляксандр Сяргеевіч Пушкін так любіў варэнне з агрэсту? Як зварыць яго так, каб яно натхніла новых пушкіных? 7 жніўня ў расійскай сталіцы можна будзе пра гэта даведацца.

17—19 ліпеня на тэрыторыі аэрапорта Мінск-1 адбудзецца другі адкрыты чэмпіянат Беларусі па паветраплаванні. Сем дзясяткаў экіпажаў-удзельнікаў стартуюць кожны дзень а сёмай раніцы. Вось гэта будзе відовішча!

9 ліпеня ў Санкт-Пецярбургу пачаўся чатырнаццаты па ліку, міжнародны па стутусе і дабрачынны па сутнасці фэст пясчаных скульптур, прысвечаны гэтым разам літаратуры. Пісьменнікаў і герояў іх кніг, выраблены з пяску, можна бачыць да канца лета на пляжы Петрапаўлаўскай крэпасці за грошы, якія пойдуць на выключна добрыя мэты.

Фэсты гістарычных рэканструкцый — гэта ўжо не дзіва, а трэнд. Баі лучнікаў, турніры вершнікаў, бугурты розныя... Але на фэсце ў Дзяржаўным музеі беларускай архітэктуры і быту ў Азярцы 27 і 28 ліпеня чакаюцца, акрамя названых «стандартных» мерапрыемстваў, яшчэ і «інтэрактывы»: навучыцца танцаваць у сярэднявечнай манеры, стрэльнуць са старажытнай зброі, сфатаграфавацца з катам, выпрабоўваючы прыстасаванні для пакаранняў на ўласнай скуры... Найхутчэй за ўсё, вы туды зберацеся.

Калі вы, як Віні-Пух, да пятніцы абсалютна свабодныя, то можаце разлічваць на «Панядзелак на ўзгорку». Кожны апошні панядзелак ліпеня ў Мексіцы, у штаце Аахака, праходзіць Гелагеца, «Панядзелак на ўзгорку», свята карэнных народаў краіны, падчас якога дэгустуецца асаблівы від тэкілы і выбіраецца багіня кукурузы.

605 гадоў з той бітвы прамінула, а як гэта было, кожны дагэтуль «памятае». Восем тысяч гледачоў штогод збірае фэст «Наш Грунвальд», што пройдзе сёлета 25 і 26 ліпеня, як заўсёды, у Дудутках. Сярэднявечныя гандлёвыя рады — гэта рэч зразумелая, ці не так? А вось сярэднявечныя атракцыёны і майстар-класы... Ну, паглядзім-паглядзім.

ЗНАЁМЦЕСЯ: КАЛЮЧЫ ІНТРАВЕРТ

Першая асаблівасць афрыканскага карлікавага вожыка выявілася літаральна перад сустрэчай з гэтым сімпатычным звярком. «Ведаеце, перад чужымі людзьмі ён не раскрыецца — схаваецца ў клубок, пачне бурчаць да той пары, пакуль вы не выйдзеце з пакоя», — заінтрыгавала мяне ўладальніца экзатычнай жывёлы, мінчанка Алеся РАМАНЧЫК.

А можа, мне пашанцуе ўбачыць мыску калючыка? Поўная спадзяванняў, іду знаёміцца.

Усмешка вожыка — найлепшы камплімент для фатографа!

КЛУБОК, РАСКРЫЙСЯ!

А шостай вечара я на парозе... Вожык «дзеліць» пакой з гаспадарамі, але цяпер тут на дзіва ціха.

— Пачакайце, зараз разбуджу яго, — кажа Алеся і накіроўваецца да вялікага шклянога тэрарыума. У «цераме», закапаўшыся ў фліс (сінтэтычную трыкатажную тканіну), спіць вожык Альс. Гаспадыня адрывае малога ад сну (гэтыя звяркі спяць больш за 12 гадзін), і калючык колеру шампанскага пачынае бурчаць. Адчуўшы новы пах, вожык адразу ж скручваецца ў абарончы клубок. Алеся кладзе цуд на ложак, і мы разам пачынаем цікаваць. Шар з іголак фырчыць, трашчыць, крыху матляецца ў розныя бакі: здаецца, вось-вось выбухне.

— Злуецца: я яго разбудзіла і прывяла «чужынца». Альс гасцей не любіць, — тлумачыць паводзіны гадаванца гаспадыня. Каб загладзіць віну перад буркуном, Алеся дастае з бляшанкі парачку «чарвякоў», якія, на самай справе, аказваюцца лічынкамі жука заафобуса. Сапраўдны далікатэс для карлікавых вожыкаў! У спакойных умовах Альс адразу вынюхвае смакату і ўмомант яе з'ядае — толькі за вушкамі трашчыць. Зараз небарака нават не варухнецца — я перашкаджаю атрымліваць асалоду ад жыцця. Аднак праз пару хвілін вожык «здаецца»: пакрысе з клубка «вырастаюць» лапкі, вельмі асцярожна паказваецца носік і «спрабуе» паветра. Хутка і акуратна малы хапае «чарвяка» і задаволена чмякае. Пасля перакусу Альс недаверліва абнюхвае тэрыторыю і зноў хаваецца ў калючыя «даспехі».

— Я здзіўлена, што ён раскрыўся, напэўна, вы яму спадабаліся, — адзначае Алеся. — Звычайна перад чужымі людзьмі Альс «замыкаецца» і бурчыць...

Шмат «прыемнасцей» мы б пра сябе пачулі, калі б вожык умеў размаўляць...

Іголкі паказваюць настрой вожыка. Калі той у гуморы, яго «шчацінкі» нагадваюць сіліконавыя — яны мяккія і складзены ў адным напрамку. Нешта не так — іголкі ідуць крыж-накрыж, такога вожыка ўжо не пагладзіш.

ХАЛАСЦЯК-АДЗІНОЧКА

Калі Альс такі інтраверт, як ён прывык да Алесі? Тым больш летась, перш чым трапіць у новы дом, вожык перажыў доўгую вандроўку ў цягніку з Віцебска (там ён нарадзіўся) да Мінска. Дзяўчына ўзгадвае: трохмесячны звярок цэлы дзень не мог апрытомнець: бесперапынна фырчаў і «страляў». Алеся пакінула калючага суседа на ноч у слоіку, каб вожык супакоіўся. Ранкам яна пачаставала небараку, і той паступова апамятаўся. Асвоіўшыся на новым месцы, ён стаў лашчыцца да новых сяброў. «Які дружалюбны наш малы», — узрадаваліся гаспадары...

Хутка Альс паказаў свой сапраўдны характар. Праз некаторы час завіталі ў госці бацькі Алесі і, вядома ж, захацелі пазнаёміцца з цікавым суседам. Вожык, учуўшы чужыя пахі, павёў сябе негасцінна: адразу ж «затрашчаў», запырхаў... Да гэтай пары Альса яшчэ ні разу не пакідалі чужым людзям, і Алеся не ведае, як ён перажыве падобную «перастаноўку». Акрамя вожыка, у доме жыве сабака па мянушцы Ліза, да якой у Альса прэтэнзій няма: ён спакойна бегае і гуляецца ў яе прысутнасці.

Алеся разам са сваім калючым сябрам, які пакуль што знаёміцца не хоча.

Вожыкі любяць быць адны, што не дзіўна з такім характарам. Нават у заводчыкаў яны не жывуць адной вялікай сям'ёй: у кожнага з іх свая тэрыторыя, свой тэрарыум. Алеся кажа, што калючыкі бываюць двух тыпаў — «злюкі» і «цікаўныя». Альс, вядома ж, адносіцца да першага тыпу. Гаспадароў ён прыняў за сваіх, перад імі можа раскрыцца ва ўсіх сэнсах. Але гэта не значыць, што яму цікава ўвесь час гуляцца з людзьмі. Каб адпачыць ад чалавечай увагі, вожык пускаецца на розныя хітрыкі. Можа прысесці, нібыта хоча ў прыбіральню: яго запускаюць у тэрарыум, а хітрун з усіх ног бяжыць хавацца ў домік. Альбо незадаволена моршчыцца і «лаецца»: «надакучылі вы мне». Іголкі паказваюць настрой вожыка. Калі Альс у гуморы, яго «шчацінкі» нагадваюць сіліконавыя — яны мяккія і складзены ў адным напрамку. Нешта не так — іголкі ідуць крыж-накрыж, такога вожыка ўжо не пагладзіш. Дый і сам ён не любіць, калі вычэсваюць яго «шчыт». Затое дазваляе гладзіць пушок на жываце.

Знаёмячыся, гаспадар мусіць браць вожыка на рукі, каб той запомніў пах свайго сябра. Калі браць малога ў пальчатках ці на ручніку, ён прывыкне да пахаў гэтых рэчаў, а не да паху вашай скуры і пасля ў голыя рукі не дасца.

СОЧЫМ ЗА ФІГУРАЙ

Пацікаваўшы, адпраўляем Альса спаць: «пухлячок» прачынаецца а дзявятай вечара. Мы ўжо ведаем, што вожыкі любяць есці заафобусаў, але яны дужа тлустыя, таму Алеся песціць Альса далікатэсам два—тры разы на тыдзень. Прусакоў, конікаў, цвыркуноў калючыкі таксама ўплятаюць з задавальненнем. Аснова іх рацыёну — варанае мяса. Сырое даваць нельга, бо могуць завесціся глісты. Альсу даспадобы дзіцячае харчаванне са смакам труса. Не адмаўляецца ён ад садавіны і гародніны — можа перакусіць кавалачкамі банана, вішні, ківі, агурка. Але вожыкі не ўсёедныя. Ні ў якім разе ім нельга даваць малако — арганізм калючыкаў атлусценне. Дарослы вожык важыць прыкладна паўкілаграма.

У тэрарыуме заўважаю трэнажор для бегу — кола. Яно большае, чым бывае ў хамячкоў: не менш за 30 сантыметраў у дыяметры, іначай вожыку было б цесна. Алеся з мужам адшукалі кола для вялікіх грызуноў, але спачатку яно рыпела — давялося мадэрнізаваць канструкцыю. Цяпер кола працуе бясшумна і нікому не перашкаджае: Альс бегае ўсю ноч, пакуль гаспадары спяць.

З домікам для вожыка давялося павазіцца. Тэрарыум замаўлялі, пасля зрабілі там «рамонт»: падлогу ўцяплілі паралонам і лінолеумам. Тут жа стаіць кармушка і паілка, а непадалёк размясцілася прыбіральня, напоўненая пілавіннем. Прыбірае ў тэрарыуме Алеся штодня: мые вадой і гаспадарчым мылам, мяняе кавалачкі флісу.

Сняданак у малога пачынаецца а дзявятай вечара. Мы ўжо ведаем, што вожыкі любяць есці заафобусаў, але яны дужа тлустыя, таму Алеся песціць Альса далікатэсам два—тры разы на тыдзень. Прусакоў, конікаў, цвыркуноў калючыкі таксама ўплятаюць з задавальненнем. Аснова іх рацыёну — варанае мяса. Сырое даваць нельга, бо могуць завесціся глісты. Альсу даспадобы дзіцячае харчаванне са смакам труса. Не адмаўляецца ён ад садавіны і гародніны — можа перакусіць кавалачкамі банана, вішні, ківі, агурка. Але вожыкі не ўсёедныя. Ні ў якім разе ім нельга даваць малако — арганізм калючыкаў не ўспрымае гэты прадукт. Таксама ў забароненым спісе значацца ананас і авакада, разынкі і вінаград, арэхі і семкі. Алеся заўважыла: Альс спажывае столькі ежы, колькі яму патрэбна, абжорам яго не назавеш.

Пры знаёмстве гаспадар мусіць браць вожыка на рукі, каб той запомніў пах свайго сябра. Калі браць малога ў пальчатках ці на ручніку, ён прывыкне да пахаў гэтых рэчаў, а не да паху вашай скуры і пасля ў голыя рукі не дасца.

ВОЖЫК МОЖА СТАЦЬ КАТОМ...

Як наконт прабежкі па лужку? Гаспадыня не выпускае вожыка на вуліцу. Там паўсюль пагрозы: холад ці скразнякі альбо кляшчы ды іншыя паразіты, якіх калючы шарык прыцягвае, як магніт. Афрыканскі вожык жыве ў памяшканні і выглядае здаровым. Ёсць, праўда, працэдуры, якія ён на дух не пераносіць. Альсу страшэнна не падабаецца купацца, хаця тое і адбываецца раз на два—тры месяцы. Не любіць, калі яму стрыгуць пазногці («рытуал» праводзіцца раз на два—тры тыдні). Да таго ж Алеся часта вычэсвае Альсу іголкі зубной шчоткай. Калючык не хавае сваіх пачуццяў, а даволі актыўна выражае пратэст. У 5—6 месяцаў у вожыкаў адбываецца лінька іголак, а ўзімку звяркі мяняюць пушок. У параўнанні з дзікімі сваякамі афрыканскія вожыкі не ўпадаюць у спячку.

Алеся любіць назіраць за тым, як Альс накідвае на іголкі сліну — маскіруецца ад магчымай пагрозы альбо, наадварот, радуецца. Дзікія вожыкі такім спосабам абараняюцца ад розных паразітаў, у «афрыканца» ж ніякіх дадатковых сяброў няма.

Алеся адзначае: гэтых жывёл лепш не дарыць дзецям — малыя любяць пацягаць звярка за лапы ці хвост (альбо калючкі), а схільныя да стрэсаў вожыкі падобных пакут не вытрымаюць. Гадаванец скруціцца ў клубок, а дзіця, найхутчэй, параніцца аб іголкі. Тым больш, вожыкі — інтраверты, якія любяць быць сам-насам. Дый даглядаць іх не так проста: не кожны гаспадар зможа прыбіраць штодня.

Аднойчы вожык пачаў муркаць. Алеся з мужам нават перапужаліся, калі ўпершыню пачулі нехарактэрныя для выхаванца гукі, і пачалі шукаць адказ на гэтую з'яву ў інтэрнэце. Альс, не зразумеўшы, чаму ўсе вакол яго носяцца, варкатаць перастаў. Аказалася, калі вожык «ператвараецца» ў ката, то сваім жыццём ён задаволены...

Зараз малому «афрыканцу» ўжо год, і, падаецца, жыве ён шчасліва. Яго гаспадары таксама не шкадуюць, што выбралі калючага суседа. Альс — незвычайная жывёла. Сваю любоў ён цалкам аддае толькі сваім сябрам.

Кацярына РАДЗЮК
radziuk@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН.

А што тут у нас на вячэру?

«Афрыканцам» абавязкова трэба шмат бегаць — іначай яны атрымаюць атлусценне.

ЦІ БРАЦЬ КАЛЮЧЫКА З ЛЕСУ?

Лясныя вожыкі так і спакушаюць забраць іх дадому ды пачаставаць малачком. Калі вы ўсё ж запрасілі звярка да сябе ў госці, то ведайце: ён не пераносіць малочныя прадукты, можа моцна атруціцца і нават загінуць. Лепш наліце вады ў сподачак. Наўрад ці ў вашай лядоўні знойдзецца ежа для вожыка: жабкі, слімакі і чарвякі. Не забывайцеся, што дзікія вожыкі пераносяць на сабе кляшчоў і блых, якія лёгка зачэпліваюцца паміж іголак.

16 ліпеня 2015 г. Сямейная газета

САЦЫВІ АД ТАРЫЕЛА МАЙСУРАДЗЭ

Папулярны спявак, кампазітар, аранжыроўшчык, кінаакцёр, тэлеі радыёвядучы Тарыел МАЙСУРАДЗЭ нарадзіўся ў Абхазіі. Пасля школы лёс закінуў яго на беларускую зямлю — тут, у Сцяпянцы пад Мінскам, давялося служыць у войску. Мінск Тарыелу спадабаўся, і пасля звальнення ў запас ён паступіў вучыцца ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. А на яго радзіме пасля распаду Савецкага Саюза пачаліся драматычныя падзеі, і неўзабаве сям'я Майсурадзэ вымушана была пакінуць родны дом і перабрацца ў Грузію.

Тарыел настойліва авалодваў артыстычнай прафесіяй і рабіў у Беларусі свае першыя крокі на эстрадзе. У 1993 годзе ён выступіў на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і стаў дыпламантам конкурсу маладых выканаўцаў. А ў 1994-м спявак пачаў працаваць салістам аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Сёння імя Тарыела Майсурадзэ добра вядома аматарам эстраднай песні.

Шчаслівыя гады дзяцінства і юнацтва Тарыела прайшлі ў горадзе Гудаўта сярод шматлікай радні. У сям'і Майсурадзэ быў свой дом, прыгожы і ўтульны. Бацька вырошчваў і здаваў дзяржаве жывёлу, маці ж вяла ўсе жаночыя гаспадарчыя справы, найперш клапацілася пра сваіх чатырох любімых мужчын — мужа і трох сыноў. Яна працавала настаўніцай пачатковых класаў і, нягледзячы на вялікую нагрузку, паспяхова спраўлялася і ў школе, і дома.

— У нас дома заўсёды былі ў вялікай колькасці сыр сулугуні, мацоні, тварог, кукурузны хлеб (мчадзі называецца)... Мама ўсё сама гатавала. Я любіў есці мчадзі з малаком. Малака ў талерку наліваеш і туды крышыш хлеб. Вельмі смачна!.. Мацоні — гэта кісламалочны прадукт накшталт сыраквашы хатняга прыгатавання. У кожнай сям'і яго рабілі. Гаспадыні адна адной перадавалі загатоўку. У цёплае малако заліваюць лыжачку гэтай загатоўкі і настойваюць ноч. І ўранку мацоні ўжо можна есці — хочаш з варэннем, хочаш проста з хлебам... Ведаеце, у той час супермаркетаў не было, але быў кірмаш. І, калі не хапала малака, куплялі яго на кірмашы, а потым дома перапрацоўвалі. Напрыклад, мама сама рабіла сулугуні. У вядры заўсёды было некалькі галовак свежага сыру... І яшчэ ў доме заўсёды былі арэхі — у грузінскай кухні шмат страў імі прыпраўляецца.

«У грузінскім застоллі асноўнае не ежа, а адносіны паміж людзьмі».

У 18 гадоў Тарыел Майсурадзэ пайшоў служыць у войска. Прычым у армію папрасіўся сам — не чакаў прызыву, шчыра хацеў абараняць сваю савецкую Радзіму.

— Размеркавальнік, дзе збіраюць усіх навабранцаў... Туды з усяго Савецкага Саюза прыязджалі «перакупшчыкі», якія набіралі ў свае вайсковыя часці спецыялістаў. Дык вось... Выклікалі 15 чалавек, паставілі, і сярод нас стаў хадзіць адзін вельмі прыязны маёр з блакітнымі пагонамі і блакітнымі вачыма. Ходзіць і гаворыць: «Ну што, авіяцыю любіце? Мы дружна: «Любім!» — «Вось і будзем лятаць!» Загрузілі нас у самалёт ТУ-154... Калі мы прыляцелі ў Мінск, было 40 градусаў марозу! Тады яшчэ новага аэрапорта не было, стаяў вялікі металічны ангар, а аэрапорт яшчэ будаваўся — толькі-толькі сцены былі ўзведзены.

За час службы Тарыелу спадабаліся і Беларусь, і беларусы, вось толькі пазнаёміцца як след з беларускай кухняй адразу не давялося.

— Ведаеце, што такое салдацкая кухня, асабліва напрыканцы 1980-х гадоў, калі ў СССР ужо быў поўны хаос?.. На першае — вада з капустай, на другое — капуста без вады, на трэцяе — вада без капусты.

«Віно з рога госцю трэба выпіць абавязкова. А калі той піць не хоча, то павінен сказаць, што ён вельмі-вельмі хворы».

Беларускія стравы ён пакаштаваў, ужо калі вучыўся ва ўніверсітэце культуры, на агульнай кухні студэнцкага інтэрната.

— Я не здымаў кватэру, навошта, калі ва ўніверсітэцкім інтэрнаце жыць было весела і цікава: студэнты, студэнтачкі!.. І кожны цягне з дому сала, варэнне, дранікі, бульбу!

Зразумела, пасля салдацкага рацыёну яго ўжо нічым нельга было здзівіць, але ўсё ж такі часам такое здаралася.

— У мяне быў шок, калі ўбачыў, што студэнты разбаўляюць вадой з-пад крана варэнне з трускалак, называюць гэта «морс» і запіваюць ім гарэлку падчас застолляў. Варэнне з трускалак — гэта ж далікатэс! І як можна чым-небудзь запіваць гарэлку? Дарэчы, я да войска яе наогул не піў. Ну, дык вось увечары ў інтэрнаце бульба смажыцца, скваркі скварчаць... Да бульбачкі ёсць кіслая капустка, каўбаска, пальцам піханая, паляндвіца. Апошняя мне даспадобы, вось чаго не «зразумеў», дык гэта вэнджанай каўбасы. У Грузіі, дарэчы, наогул няма культу каўбасы і вэнджанага мяса. Там клімат іншы, цёплы. У Беларусі каўбасу ў верасні зробяць, і яна да вясны захоўваецца. А ў Грузіі ў многіх дамах нават няма ацяплення. Таму грузінская кухня — гэта ўсё свежапрыгатаванае: з мукі, кукурузы, фасолі, малака... Тут, у Беларусі, падчас застолляў любяць халодныя закускі, а ў Грузіі — гарачыя вострыя стравы. Вострая ежа прымушае кроў хутчэй бегчы па жылах. Я не магу без спецый, цяпер купляю іх на Камароўцы. Вось, напрыклад, люблю сванскую соль...

Усім добра вядомы грузінскія гасціннасць і шматлюдныя застоллі. Тарыел тлумачыць, што ў Грузіі вельмі шануецца сям'я, і калі ладзіцца свята, то гаспадар запрашае на яго ўвесь свой род. Так патрабуюць шматвяковыя традыцыі.

— Калі ў дзяцінстве да нас прыходзілі госці, за стол садзілася не менш за 20—25 чалавек! Клікалі суседзяў, радню — татаву і маміну... Абавязкова прыходзілі жанчыны, якія дапамагалі гаспадыні прыгатаваць стол. Яны пяклі хачапуры, лабіяні (гэта накшталт хачапуры, толькі ў цеста замест сулугуні дабаўляецца фасоля), гатавалі чахахбілі з курыцы, рабілі мамалыгу з кукурузнай мукі і сулугуні... Ну і, вядома, на стале заўсёды прысутнічалі памідоры, агуркі — свежыя і салёныя, вельмі папулярнай была кіслая чырвоная капуста, такая хрусткая!.. Але ў грузінскім застоллі асноўнае не ежа, а адносіны паміж людзьмі. Госці размаўляюць, гавораць тосты. За сталом ствараецца сяброўская атмасфера, чалавек зараджаецца пазітыўнай энергіяй. Таму так часта наладжваюцца застоллі, дзе ёсць і смачныя вострыя стравы, і цёплыя размовы, і віно, і рог. Віно з рога госцю трэба выпіць абавязкова. А калі той піць не хоча, то павінен сказаць, што ён вельмі-вельмі хворы.

З асаблівай цеплынёй Тарыел расказвае пра ролю гаспадыні ў грузінскай сям'і.

— Я сказаў бы, што ў Грузіі, хутчэй, пануе матрыярхат. Многія гавораць: там жанчына прыніжана, яна падчас застолля за сталом не сядзіць! А жанчына проста занятая тым, каб госцю дагадзіць, каб смачна яго накарміць, каб усё было як след і каб яе сям'я была на высокім узроўні. Яна таксама прысядзе за стол, не хвалюйцеся. У Грузіі практычна ўсё пачынаецца са слова «Маці». Напрыклад, маці-зямля, маці — стрыжань дома (тое, на чым дом трымаецца)... У першую чаргу жанчына — маці. І якой бы значнай асобай ні быў мужчына (міністр ці палкаводзец), у яго ёсць маці, якая фарміруе яго і перажывае за яго, пакуль жыве.

Размова пра ролю жанчыны ў сям'і распачалася невыпадкова. У Тарыела Майсурадзэ былі два шлюбы і абодва распаліся. З першай жонкай спявак захаваў добрыя сяброўскія стасункі, пастаянна клапоціцца пра сына Георгія, які сёлета ўжо скончыў універсітэт. А вось развод з другой жонкай выліўся ў... 168 судовых пасяджэнняў: Тарыел змагаўся за права выхоўваць сваю дачку Цінаці. І выйграў! Дарэчы, спявак і сёння лічыць, што на атмасферу ў сям'і ніякім чынам не ўплывае тое, што муж і жонка часам падбіраюцца розных нацыянальнасцей, што яны выхаваны на розных традыцыях, у іх розныя кухні і розныя любімыя стравы. На яго погляд, уся справа ў каханні ці ў яго адсутнасці.

«У доме заўсёды былі арэхі — у грузінскай кухні шмат страў імі прыпраўляецца».

— Здараецца, што жонка-мусульманка зарабляе грошы, а муж займаецца дзецьмі. Я нядаўна сустракаўся з такімі ў Маскве. І жывуць яны цудоўна! Сучаснае жыццё растлумачыла разумнай частцы насельніцтва, што ўсе людзі роўныя, Бог адзіны, а ўсё астатняе залежыць ад размеркавання ў сям'і роляў і рахункаў. Калі гэта сям'я, дзе пануюць каханне і павага, то, нават калі жонка не спраўляецца па гаспадарцы, муж заўсёды дапаможа ёй. А калі ён раптам захоча з'есці нейкую сваю нацыянальную страву, то возьме і сам згатуе або пакажа жонцы, як гэта зрабіць. Дык што, сучасная, добраадукаваная жанчына не можа навучыцца гатаваць страву, якая так падабаецца яе каханаму мужу? Абсурд! Тут справа не ў страве — проста жанчыне не падабаецца яе муж. Па сабе ведаю: калісьці мой сын быў маленькі, цяпер дачцэ восем гадоў — мне падабаецца клапаціцца пра іх, мяне хвалюе, што яны ядуць. Я вару для іх супчыкі, гатую нейкія стравы, таму што люблю іх. Значыць, калі вы не хочаце гатаваць — найміце хатнюю работніцу! І яна вельмі хутка навучыцца дагаджаць вашаму мужу. Гэта будзе больш сумленна. Лічу, што добрыя, моцныя адносіны ў сям'і трэба выхоўваць.

Наша размова адбывалася ў адным са сталічных рэстаранаў, вядомых сваёй грузінскай кухняй. Тут наведвальнікам прапануюць хачапуры, сацыві, чахахбілі, лобіа і яшчэ шмат грузінскіх страў, якія так любіць спявак. Ён сказаў, што ўсё гэта ўмее гатаваць і падзяліўся рэцэптам прыгатавання сацыві.

— Гэта мой фірменны рэцэпт. Сацыві можна есці халодным — з мясам, з лавашом, можна выкарыстоўваць яго як соус да страў, напрыклад да курыцы. Вельмі смачна і зручна — нічога не трэба падаграваць.

Сёлета Тарыелу Майсурадзэ споўніцца 45 гадоў. Гэтую падзею ён адзначыць разам са сваімі прыхільнікамі юбілейным сольным канцэртам у адной з найлепшых залаў краіны. І, думаю, не абыдзецца без гасціннага грузінскага застолля — для родных і шматлікіх сяброў.

Тамара БУНТА.



САЦЫВІ

Спатрэбіцца: *1 курыца (каля 1,5 кг), курыны булён, 500 г ачышчаных грэцкіх арэхаў, 2 ч. лыжкі сушанай каляндры, 1/2 ч.лыжкі шафрану; 1 ч. лыжка молатага чырвонага перцу, 3 зубчыкі часнаку, 1 рэпчатая цыбуля, 3 яечныя жаўткі, 1/2 ст. лыжкі віннага воцату, соль, молатая карыца, гваздзіка — на смак.*

Курыцу памыць, заліць 2 літрамі вады і варыць на сярэднім агні 50—60 хвілін. Потым пакласці на бляху грудзінкай уніз і смажыць у духоўцы да гатоўнасці, час ад часу паліваючы сокам, які вылучаецца з курыцы. Гатовую курыцу парэзаць на невялікія кавалачкі, можна папярэдне выдаліць косткі. Ачышчаныя арэхі здрабніць у блэндары або ў ступцы, дабавіць да іх прапушчаны праз часночніцу часнок, сушаную каляндру, шафран, чырвоны перац, молатыя гваздзіку і карыцу. Усё перамяшаць. Пасля дабавіць да арэхаў жаўткі і добра вымесіць. Цыбулю дробна пакрышыць і таксама змяшаць з арэхамі. Уліць астылы курыны булён у такой колькасці, каб атрымалася аднародная кашка кансістэнцыі густой смятаны. Гэтую кашку 3—4 разы прапусціць праз сіта. У выніку атрымаецца досыць вадкая маса — соус. Цвёрдыя рэшткі, якія засталіся ў сіце, выкінуць, яны не спатрэбяцца. Паставіць каструлю з соусам на агонь і зняць, як толькі на паверхні з'явяцца першыя бурбалачкі. Тут жа пакласці ў каструлю кавалачкі курыцы, перамяшаць і даць астыць, пасля чаго дабавіць у соус вінны воцат і соль на смак. Ні ў якім разе нельга ўліваць воцат у гарачы соус: ён можа пацямнець!

Сацыві падаваць да стала халодным з зелянінай і белым хлебам. Можна ўпрыгожыць гранатавымі зярняткамі.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом № 8 по генплану»)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р.Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
7. Жилой дом № 28 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства 13 месяцев.
8. Жилой дом № 7 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
9. Жилой дом № 9 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 8 месяцев.
10. Жилой дом № 32 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 11 месяцев.
11. Жилой дом № 11 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.

Информация о проекте и об объекте строительства:

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству 80% общей площади жилых помещений граждан, из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска.

Положительные заключения государственной экспертизы № 11-15/13 от 18.02.2013 г., № 268-15/15 от 22.05.2015 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 8 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь строительства.

Характеристика объекта.

Объект – 113-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М111-90 со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и осуществляющих строительство по направлениям администраций районов г. Минска:

Для нормативной площади:

- с государственной поддержкой и без государственной поддержки – 8 058 000 руб.;

Для площади, превышающей нормативную:

- с государственной поддержкой и без государственной поддержки – 16 444 000 руб.

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 24 сентября 2014 г. № 500/1393-3953. Площадь земельного участка – 0,0790 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 113.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 1-й квартал 2015 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 1-й квартал 2016 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента № 263 от 6 июня 2013 г. Гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 84 квартиры, из них 13 однокомнатных квартир общей площадью 45,17 м², жилой площадью 17,96 м²; 8 однокомнатных квартир общей площадью 44,92 м², жилой площадью 17,96 м²; 14 двухкомнатных квартир общей площадью 60,57 м², жилой площадью 31,09 м²; 3 двухкомнатные квартиры общей площадью 60,32 м², жилой площадью 31,09 м²; 9 двухкомнатных квартир общей площадью 68,20 м², жилой площадью 31,09 м²; 7 трехкомнатных квартир общей площадью 78,05 м², жилой площадью 45,10 м²; 4 трехкомнатные квартиры общей площадью 77,80 м², жилой площадью 45,10 м²; 7 трехкомнатных квартир общей площадью 85,68 м², жилой площадью 45,10 м²; 8 четырехкомнатных квартир общей площадью 106,41 м², жилой площадью 58,54 м²; 4 четырехкомнатные квартиры общей площадью 105,91 м², жилой площадью 58,29 м²; 7 четырехкомнатных квартир общей площадью 113,79 м², жилой площадью 58,29 м².

Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет №1, тел. 207 19 15) с 22 июля 2015 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина, его паспорт и направление администрации района г. Минска на строительство квартиры.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

Извещение
о проведении торгов в форме открытого аукциона
Организатор аукциона:
коммунальное консалтинговое унитарное предприятие
«Витебский областной центр маркетинга»,
210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. 8 (0212) 42-61-62.

Продавец: Открытое акционерное общество «Лепельский ремонтно-механический завод», 211174, Витебская обл., г. Лепель, ул. Партизанская, 2, тел.: 8 (2132) 4-06-89, 4-07-33.

Лот №1. Капитальное строение с инвентарным №230/С-12396, площадью – 16,2 кв.м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – насосная станция, расположенное по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Г, расположенное на земельном участке с кадастровым №222750100001005408, площадью 0,2516 га для обслуживания здания насосной станции. **Начальная цена:** 51 000 000 бел. руб. без учета НДС**. Размер задатка:** 5 100 000 бел. руб.

Аукцион состоится **17.08.2015 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 16.07.2015 с 8.30 по 14.08.2015 до 17.30. Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ.лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 17 августа 2015 года в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.

Организатором аукциона является

республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

1. Помещение №20, арендуемой площадью 34,4 кв.м, на первом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 032 000 рублей; размер задатка – 103 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

2. Помещение №204, арендуемой площадью 14,0 кв.м, на втором этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 420 000 рублей; размер задатка – 42 000 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

3. Помещение №314, арендуемой площадью 31,4 кв.м, на третьем этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 942 000 рублей; размер задатка – 94 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

4. Помещение №329, арендуемой площадью 44,4 кв.м, на третьем этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 332 000 рублей; размер задатка – 133 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

5. Помещение №412, арендуемой площадью 31,1 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 933 000 рублей; размер задатка – 93 300 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

6. Помещение №417, арендуемой площадью 23,9 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 717 000 рублей; размер задатка – 71 700 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

7. Помещение №420, арендуемой площадью 35,3 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 059 000 рублей; размер задатка – 105 900 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

8. Помещение №428, арендуемой площадью 35,8 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 074 000 рублей; размер задатка – 107 400 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

9. Помещение №517, арендуемой площадью 23,6 кв.м, на пятом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 708 000 рублей; размер задатка – 70 800 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

10. Помещение №532, арендуемой площадью 27,3 кв.м, на пятом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 819 000 рублей; размер задатка – 81 900 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей.

Документы на участие в аукционе принимаются с 16 июля 2015 года по 14 августа 2015 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 14 августа 2015 года, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 15 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефон для справок: (8-017) 209-90-93, (8-017) 209-92-78.

■ Фотаздымак з гісторыяй

ПАЛЯВАННЕ Ў ЖЫЦЕ

...Заставаліся лічаныя дні да дэмабілізацыі, да вяртання ў сваё роднае мястэчка Смілавічы, калі пачалася вайна. Вучэбна-артылерыйскі полк з ваеннага гарадка, што паблізу Маладзечна, у якім мой дзядзька, старшы сяржант Пётр Мікуліч, быў камандзірам дзвюх 45-метровых гармат, 22 чэрвеня 1941 года рушыў у напрамку дзяржаўнай мяжы, насустрач ворагу. Коні выцягнулі гарматы ў чыстае поле. Мікуліч убачыў наперадзе нізіну, зарослую хмызняком. Усё было ціха, спакойна, толькі чуліся ржанне коней ды скрып колаў. Нішто не нагадвала пра вайну. Ласкава свяціла сонейка, спявалі птушкі, у невысокім жыце красавалі валошкі. Букецік з іх падарыла яму каханая, праводзячы ў армію...

Пётр Мікуліч (у цэнтры) з саслужыўцамі, 1940 год.

Вайна... Якая вайна? Слухаючы птушак, цяжка было ў гэта паверыць. Здавалася, полк накіроўваецца на чарговыя вучэнні. Толькі некалькі дзён назад слухалі заяву ТАСС, выступаў Молатаў. Запэўніў, што ніякай вайны не чакаецца, а чуткі пра вайну — правакацыя. Шмат камандзіраў было адпраўлена ў водпуск...

Раптам з хмызняку затрашчалі кулямётныя чэргі. Хто ж думаў, што там, заглушыўшы маторы, прытаіліся нямецкія танкі?

Людзі з пяхотнай калоны, якая рухалася той жа дарогай, пачалі валіцца, як снапы. Стогны, лямант. Ні дрэўца, ні кусціка, ні канаўкі, каб укрыцца... Два разлікі Мікуліча з «саракапяткамі» аказаліся перад браніраванымі машынамі гітлераўцаў як на далоні. Адзін з разлікаў адразу быў зрэзаны, нібы касой. Конь паваліўся, пачаў біць капытамі і хрыпець, з яго шыі струменьчыкам біла кроў... Усё гэта Пётр убачыў бакавым зрокам, ліхаманкава, разам з іншымі адчэпліваючы ад перадка двухколкі гармату, разварочваючы яе. Ускінуўшы да вачэй бінокль, убачыў адзін з танкаў, які з-за куста вёў бесперапынны агонь. Усё адбылося хутка, нязвыкла, нават думка не прыходзіла ў галаву, што яго таксама можа зрэзаць чарга. Таму стаяў не прыгінаючыся, у поўны рост. Раптам адчуў, як моцна запякло ў назе і плячы.

Што тварылася вакол, ён не ведаў. Усю ўвагу скіраваў на «свой» танк. Першы снарад «саракапяткі» разарваўся ззаду браніраванай нямецкай машыны, потым — спераду... Цэль вось-вось будзе накрыта. Але зараўлі ў ляску танкавыя маторы. Стальныя страшыдлы, ведучы беглы агонь і манеўруючы, рынуліся на паходную калону. Было сапраўднае пекла: звон, свіст, скрыгат, ржанне смяротна параненых коней, крыкі людзей. Аднекуль ляцелі камякі зямлі. Едкі смурод слаўся над полем. Паспелі зрабіць толькі некалькі выстралаў, як адзін з танкаў аказаўся побач і раздушыў гармату. Кінуўшыся ў жыта, Пётр паспеў заўважыць, як з люка выскачыў немец і выстраліў з пісталета некалькі разоў у галаву зараджаючаму — высокаму прыгожаму масквічу Хрэсіну.

Заўважыўшы параненага Пятра, які, кульгаючы, бег да жыта, нямецкі танкіст апусціўся ў люк і накіраваў машыну следам. Пётр ужо дабег да жыта, але ў гэты момант жалезная грамадзіна навісла над ім, пагражаючы раздушыць. Інстынктыўна, ён упаў паміж гусеніц. Ад днішча танка дыхнула жарам, нібы з печы, жалезная гара з лязгам прасунулася над ім. Жывы! Але гітлераўец развярнуў машыну і зноў кінуў яе на чалавека. Пётр зноў распласталася паміж гусеніц. Так паўтаралася шмат разоў. «Госпадзі, змілуйся...» — шаптаў ён. Адкуль толькі браліся сілы для сапернічства з маторам! Раненая нага распухла, ліпкая кроў напоўніла бот, лопнула халява, агнём гарэла плячо, а Пётр зноў і зноў адбягаў ад танка і кідаўся паміж гусеніц. Едкі танкавы дым і пот раз'ядалі вочы, ад страты крыві наступала млявасць, а немец забаўляўся, як кот з мышшу. Але для Пятра цаной гэтай «гульні» было жыццё...

Губляючы прытомнасць ад страты крыві, Пётр нейкім цудам умудрыўся ў апошні момант адсунуцца ад гатовай вось-вось расплюшчыць яго гусеніцы. Якую ж садысцкую радасць (ці злосць?) адчуваў у гэты момант танкіст, палюючы на бездапаможнага чалавека!

Вечарэла. Набліжалася хвіліна, калі павінна было ўсё скончыцца... Калі немец зразумеў, што занадта ён захапіўся паляваннем на чалавека, наступіла расплата: з лесу па танку ўдарылі нашы гарматы.

Перад тым, як праваліцца ў цемру непрытомнасці, Пётр убачыў, як успыхнуў ненавісны танк. На полі бою яго падабралі нашы санітары.

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,

г. Мінск

■

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.

■ Успамін дзяцінства

КАНАПУШКІ НА КРЫЛАХ

Вясна для нас, сельскіх дзяцей, асацыіравалася з прылётам птушак, асабліва ластавак. Яны з года ў год ляпілі з гліны пад маціцай у хляве свае гнёзды. Як толькі з'яўлялася траўка на лузе, карову выганялі на пашу і хлеў цэлы дзень стаяў адчынены. Птушачкі снавалі туды-сюды. Некаторыя «рамантавалі» сваё ранейшае гняздо, якое за зіму пахінулася, іншыя, пэўна, радня, побач ляпілі новыя. Мы, дзеці, любаваліся іх няспыннай працай.

Як стала я падрастаць, то на носе і шчочках з'явіліся канапушкі. Мне гэта не падабалася. Пытаюся ў сваёй цёці Амілі: «Адкуль яны ўзяліся, гэтыя непатрэбныя цёмныя плямкі?»

— Іх прынеслі на крылах ластаўкі, — адказала яна.

Я задумалася: можа, і праўду яна кажа. Зімою ж не было іх. А як вясна прыйшла, і рабацінне на твары з'явілася. Няўжо любімыя птушкі прынеслі мне шкоду?

— Як мне пазбавіцца ад гэтых канапушак? — зноў я трывожу цёцю. Мне тады было гадоў пяць. Усё прымала за чыстую манету. Тым больш што ў тыя часы не было ніякай касметыкі.

— Дам табе такую параду. Яшчэ не з'явіліся ластаўкі. Яны прыляцяць, як цёпла стане і мошкі розныя з'явяцца, каб было чым сілкавацца. Калі ты першую птушачку заўважыш, то, дзе стаіш і што будзе на тым месцы пад рукой, тым і памаж тварык, — адказала цёця.

— А калі нічога не будзе? — дапытваюся.

— Тады хоць граззю натры тварык.

Усталявалася цёплае веснавое надвор'е. Прыляцелі з выраю амаль усе птушкі. Прыглядаюся, каб хутчэй пабачыць ластавак. І вось стаю каля хаты, а мне ледзь не пад ногі адна прашмыгнула. Што рабіць? Нічога ж побач няма. Прыгадала цёткіну параду: узяла тут жа жменьку гліны і давай ёй твар мазаць. Ну, не іначай, як маленькае чарцяня атрымалася. Стаю, чакаю. Хутка гліна стала падсыхаць і адвальвацца. «Ну, — думаю, — адваліцца з ёй і рабацінне». Як заўважыла такі цуд маці, спужалася, што гэта са мной сталася, і павяла мяне наўпрост да студні, каб прамыць твар...

З узростам рабацінне знікла само, у нейкай ступені і касметыка дапамагла. Мінула з таго часу шмат гадоў. А з прылётам ластавак кожны раз прыгадваю той выпадак. Якое ж было бяскрыўднае, наіўнае, цікавае, цудоўнае дзяцінства.

Кацярына СОСНА,

г.п. Шаркаўшчына

■

ЦЯГНІК ЗАБАЎ

(для малечы)

Лабірынт

3D малюнак



Знайдзіце 10 адрозненняў

Загадка

Красавала, чырванела
кветачка на градках.
Як пялёсткі абляцелі —
засталася хатка.
Патрасеш — яна звініць.
Хто ў хаціне той
сядзіць?
Булкам адмысловы
смак
надае звычайны...

(Мак).

Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.

Людзі кажуць: ***«ПАДСАДЗІ ДЗЯДУЛЮ НА ПЕЧ, ЦЯБЕ ЎНУКІ ПАДСАДЗЯЦЬ».***

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

■ На свае вочы

Напрыканцы мая і на пачатку чэрвеня гэтага года група беларускіх архітэктараў наведала Кітайскую Народную Рэспубліку. Гэта была рабочая паездка, неабходная дзеля вывучэння будаўнічага вопыту дзяржавы, з якой сябруем і актыўна супрацоўнічаем, якая мае найбольш дынамічныя тэмпы эканамічнага развіцця ў свеце. Паездка была выдатна спланавана — кожны дзень сустрэчы на будаўнічых пляцоўках, у інстытутах, адміністрацыйных і кіруючых установах. У складзе групы быў дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ, доктар архітэктуры, прафесар Армэн Сардараў. Сваімі ўражаннямі і назіраннямі ён дзеліцца з чытачамі «Звязды».

Сучасны Шэньчжэнь.

ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ ПАДНЯБЕСНАЙ

Што змянілася ў Кітаі за апошнія 25 гадоў

Дзіўна адчуваеш сабе, калі вяртаешся туды, дзе не быў 25 гадоў. Гэтыя асаблівыя пачуцці прыйшлі да мяне, калі я зноў стаяў на плошчы Цяньаньмынь у цэнтры Пекіна, успамінаючы свой прыезд сюды ў далёкім 1989 годзе. Вось — тая ж Брама Нябеснага Спакою, той жа будынак Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, безліч людзей, сцягі, кветкі вакол... Так, усё тое ж. Але не зусім. Значна менш веласіпедыстаў, значна больш аўтамабіляў, нярэдка найноўшых мадэляў. Людзі апрануты не так аднастайна, больш страката і модна...

Праляцелі гады, Кітай стаў зусім іншым, змяніліся і мы. І вось з'явілася магчымасць супаставіць убачанае і пазнаёміцца з новым Кітаем

Першае, што разумееш: многімі падзеямі і ўчынкамі людзей тут кіруюць кансерватызм і вернасць традыцыям. Гэты кансерватызм абапіраецца на ментальнасць народа, якая ў сваю чаргу глыбока звязана з традыцыйнай кітайскай філасофіяй. Становіцца зразумелым, чаму ў запале «кітайскай перабудовы», яны (кітайцы) не адкінулі шмат чаго з назапашанага, не спяшаліся з падзелам уласнасці, не знішчалі помнікі мінулым кумірам. «Так, — казалі яны, — давайце зробім рынак, зробім канкурэнцыю і прыватную ўласнасць, але пад жорсткім кантролем партыі і дзяржавы». І ў іх атрымалася.

Вось, напрыклад, Шэньчжэнь — дзівосны 10-мільённы мегаполіс на беразе Паўднёва-Кітайскага мора на мяжы са славутым Ганконгам. Тады, 25 гадоў таму, колішні лідар Кітая Дэн Сяапін казаў: «Вось тут, на гэтым месцы, будзе камуністычны Ганконг!» (Гэтая англійская калонія тады была сімвалам багацця, фінансавым цэнтрам усёй Паўднёва-Усходняй Азіі.)

Цяпер бронзавы Дэн з самай высокай кропкі Шэньчжэня глядзіць на новы горад сваёй мэты. Тое, што англічане пабудавалі больш чым за 150 гадоў, кітайцы стварылі за 25. Сённяшні Шэньчжэнь — гэта сапраўдны горад новага часу.

Вось, напрыклад, будынак вышынёй больш за 600 метраў (такіх у свеце 5-6). Зрэшты, будаўніцтва вышынных дамоў у Кітаі не рэдкасць — яны паўстаюць і ў Пекіне, і ў Шанхаі, і ў іншых гарадах. Дарэчы, у Пекіне мы наведалі будаўніцтва хмарачоса, якое вядзе фірма CITIK, таксама вядомая і ў Беларусі. Ён будзе мець 540 метраў у вышыню і 40 у глыбіню. Суперсучасныя будаўнічыя тэхналогіі выкарыстоўваюцца тут. На гэтым месцы прыходзіць разуменне яшчэ адной кітайскай мудрасці — заўсёды вучыцца! Калі бачыш, як прымяняюцца самыя новыя тэхналогіі, разумееш, што кітайцы ўвесь час вучацца ў іншых краін і народаў, асабліва таму, што звязана з навукай, тэхнікай, але застаюцца сабой у духоўным жыцці.

Добрую арганізацыю бачыш у Кітаі не толькі на будаўнічых пляцоўках, але і ў такіх галінах гарадской гаспадаркі, як, напрыклад, арганізацыя руху гарадскога транспарту. Мы наведалі ў Шэньчжэні цэнтр, дзе з дапамогай сучасных электронных прыстасаванняў і прыбораў кантралюецца рух грамадскага транспарту, увесь трафік горада, нават узровень забруджанасці паветра.

Безумоўна, транспартныя праблемы вырашаюцца тут найперш за кошт добра спраектаваных і пабудаваных дарог і вуліц. На некалькіх магістралях, напрыклад, мы бачылі спецыяльныя каляровыя пакрыцці на палосах руху грамадскага транспарту, што спрыяе бяспецы.

Асаблівых слоў заслугоўваюць тамтэйшыя зялёныя зоны: скверы, вуліцы, плошчы, насаджэнні ўздоўж аўтамабільных дарог. Усё вельмі добра ўладкавана, трымаецца ў абсалютным парадку і чысціні. Кожнаму дрэву і кусту надаецца свая форма — абразаюцца лішнія галінкі, стрыжэцца лістота.

Яшчэ больш уражваюць паркі. Тут кітайцы непераўзыдзеныя майстры, бо кітайскіх садоўнікаў запрашалі ў Еўропу яшчэ ў XVIII стагоддзі.

Цікава, што гэтая традыцыя садовага будаўніцтва таксама мае старажытныя духоўныя карані. У кітайцаў існуе традыцыя назірання прыроды, яе асаблівы культ, чаму шмат стагоддзяў спрыялі жывапіс і паэзія. Так падыходзіш да разумення прыгажосці кітайскіх садоў і паркаў — усё тут зроблена, каб найбольш часу любавацца вадой, дрэвамі, кветкамі і камянямі.

Вельмі добра арганізавана і турыстычная галіна. Калі 25 гадоў таму добрых гатэляў было зусім няшмат, то сёння яны сустракаюцца на кожным кроку. Тое ж з грамадскім харчаваннем. Калісьці я хадзіў па Пекіне, шукаючы сталовую, дзе можна з'есці гарачага булёну з лапшой. Зараз больш складана знайсці менавіта такую танную сталовую, чым паеўрапейску абсталяваную і з еўрапейскімі напоямі і ежай кавярню або рэстаран.

Гэта таксама вельмі важна з пункту гледжання развіцця турыстычнай індустрыі. Гістарычныя зоны вельмі добра абсталяваны, зручныя для наведвальнікаў. Уваходныя квіткі каштуюць нятанна.

Натоўп турыстаў паўсюль, і найперш гэта не інтурысты, а тыя ж кітайцы — мясцовыя жыхары і госці з іншых рэгіёнаў, якія цікавяцца сваёй гісторыяй, культурай, архітэктурай.

Гіпермаркеты ў Кітаі запоўнены разнастайнымі прадуктамі харчавання і іншымі рэчамі. Кошты амаль што мінскія, у крамах шмат пакупнікоў. Іншая справа, што вуліцы тут «не ціснуць рэкламай», тое ж можна сказаць і пра аўтамагістралі. Людзі заклапочаны рознымі справамі, але і тут успамінаецца адна кітайская мудрасць: «Прызначэнне рэчаў у тым, каб задавальняць патрабаванні людзей, а не ў тым, каб яны падпарадкавалі іх жыццё».

Вяртаючыся з падарожжа, не можаш не думаць аб лёсе Кітая, яго старажытнай мудрасці, яго вернасці традыцыям і накіраванасці ў будучыню.

Армэн САРДАРАЎ

Помнік Дэн Сяапіну ў Шэньчжэні.

Пекін, 1989 г.

■ Смачна есці!

ПРЫЧАКАЎ ПЯТРА — СЫР З'ЯСІ

Калі завяршаўся Пятроўскі пост, згодна з народнай традыцыяй было прынята абавязкова разгаўляцца сырам і маслам. Таму, хто не зробіць гэта, абяцалася не дачакацца такога ж разгавення праз год. Жыхары Бялыніччыны, Андрэй Супіталёў і Святлана Магілеўчык, вырашылі падрыхтавацца да святочнага дня і зрабіць традыцыйны сялянскі сыр уласнымі рукамі.

«Добра вядома, што традыцыйная беларуская кухня была сезоннай, — расказвае Святлана. — Таму звычай ужываць у ежу малочныя прадукты у час такіх святаў, як Масленка ці Пятроў дзень, маюць як рэлігійнае, так і ўтылітарнае тлумачэнне. Зімой, у пачатку лютага, у сялянскіх гаспадарках назіраўся масавы расцёл кароў. Такое малако было вельмі тлустае і не зусім карыснае для арганізма. З яго рабілі масла і сыры. А першая палова лета — гэта перыяд «вялікага малака», на які прыходзіцца пік надояў. Тлустасць яго была меншая, і сыры, якія рабілі з такога малака, добра захоўваліся ў спякотныя дні».

Козачкі-карміцелькі сустракаюць гаспадыню на лузе.

«Што цікава, да XVIII стагоддзя іншага сыру, акрамя тварожнага, у нас не ведалі. Ва ўсялякім выпадку сяляне, — далучаецца да гутаркі Андрэй. — Першыя спробы масавай вытворчасці звычайных сёння сычужных, ці ферментаваных, сыроў прыпадаюць на сярэдзіну XIX стагоддзя. Тэхналогія сычужнага сыраробства трапіла да нас ажно з Галандыі. Яго вырабляюць не з прасаванага тварагу, а з малака, што згортваецца пад уздзеяннем ферменту хімазіну, які атрымліваецца з сычужнай часткі страўніка маладых цялят».

«Але мы гатуем традыцыйны клінковы сыр, — дзеліцца сакрэтам Святлана. — Карову ў гаспадарцы не трымаем, але гадуем пяць козачак, якія шчодра адорваюць нас малаком. У нас сыр — з казінага малака. З вечара я паставіла закісаць яго ў гліняных гарлачах. Каб хутчэй скісла, можна дабавіць крыху сыраквашы. Зараз малако выліваем у вялікую пасудзіну і ставім адтаплівацца ў добра выпаленую печ. У каго няма печы, можна выкарыстаць духоўку. Потым даём яму крыху астудзіцца, зліваем сыроватку. Дабаўляем крыху солі на смак. У якасці дабаўкі можна выкарыстаць таксама зеляніну і кмен. Памятаю, што мая бабуля для вырабу сыру выкарыстоўвала спецыяльна пашытую з палатна торбу ў форме кліна. У яе выкладвала тварожную масу, адціскала рукамі, а потым падвешвала гэтую торбу на пэўны час над якой-небудзь пасудзінай, каб сцякла астатняя сыроватка. І мы так робім. Спавіты ў марлю сыр кладзём у рондаль паміж дзвюма дошкамі, прыціскаем каменем. Ён зацвярдзее да патрэбнай кансістэнцыі і прыкладна праз 12 гадзін будзе гатовы»

▲ Малако кісліцца ў гліняных гладышах.


◄ Сыр пад гнётам.

▼ Сыр на талерцы.

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием участников
ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»
11.06.2015 (Протокол №б/н)

ИЗМЕНЕНИЕ №1 В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ТРЕТЬЕГО ВЫПУСКА

Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»)

